В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

# 4

Частка 2



## Склонавыя канчаткі прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду

| Склоны | Пытанні | Канчаткі | |
|---|---|---|---|
| | | пасля цв. і зацв. зычных | пасля мяккіх зычных |
| Н. | які?<br>якое? | *-ы* (м. р.)<br>*-óе, -ае* (н. р.) | *-і* (м. р.)<br>*-яе* (н. р.) |
| Р. | якога? | *-óга, -ага* | *-яга* |
| Д. | якому? | *-óму, -аму* | *-яму* |
| В. | якога?<br>які?<br>якое? | *-óга, -ага* (м. р.)<br>*-ы* (м. р.)<br>*-óе, -ае* (н. р.) | *-яга* (м. р.)<br>*-і* (м. р.)<br>*-яе* (н. р.) |
| Т. | якім? | *-ым* | *-ім* |
| М. | якім? | *-ым* | *-ім* |

## Склонавыя канчаткі прыметнікаў множнага ліку

| Склоны | Пытанні | Канчаткі | |
|---|---|---|---|
| | | пасля цв. і зацв. зычных | пасля мяккіх зычных |
| Н. | якія? | *-ыя* | *-ія* |
| Р. | якіх? | *-ых* | *-іх* |
| Д. | якім? | *-ым* | *-ім* |
| В. | якіх?<br>якія? | *-ых*<br>*-ыя* | *-іх*<br>*-ія* |
| Т. | якімі? | *-ымі* | *-імі* |
| М. | якіх? | *-ых* | *-іх* |

## Склонавыя канчаткі прыметнікаў жаночага роду

| Склоны | Пытанні | Канчаткі | |
|---|---|---|---|
| | | пасля цв. і зацв. зычных | пасля мяккіх зычных |
| Н. | якая? | *-ая* | *-яя* |
| Р. | якой? | *-óй, -ай* | *-яй* |
| Д. | якой? | *-óй, -ай* | *-яй* |
| В. | якую? | *-ую* | *-юю* |
| Т. | якой? | *-óй (-óю), -ай (-аю)* | *-яй (-яю)* |
| М. | якой? | *-óй, -ай* | *-яй* |

## Слоўнікавыя словы

паштальён
плывец
гараджане
секунда
памочнік
цвісці
услых
да пабачэння
аб'язджаць

тэлеграма
берэт
улетку
ледзьве
ззяць
дэлегацыя
апетыт
подпіс
уверсе

грымець
ахвотна
сёння
балерына
вуліца
чацвёрты
унізе
меншы

В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 4 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках

Частка 2

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2018

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 811.161.3(075.3=161.3=161.1)
ББК 81.2Беи-922
С24

Р э ц э н з е н т ы:

дацэнт кафедры славянскіх моў установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат педагагічных навук, дацэнт *А. В. Вернікоўская*;

метадычнае аб’яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія з беларускай мовай навучання № 23 г. Мінска» (настаўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі *Н. В. Няборская*)

## Умоўныя абазначэнні:

— правіла;

Завяжы вузялок! — важная інфармацыя;

 — дадатковае творчае заданне, якое выконваецца па жаданні;

 — слоўнік;

?! — праблемнае пытанне;

Рм — заданне па развіцці маўлення;

 — дамашняе заданне.

**ISBN 978-985-594-021-1 (ч. 2)**
**ISBN 978-985-594-019-8**

© Свірыдзенка В. І., 2018
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2018

Правообладатель Национальный институт образования

# ПРЫМЕТНІК

## Змяненне прыметнікаў па родах, ліках і склонах

### Успомніце

Што вы ведаеце пра прыметнік?
Выкарыстайце схему.

**Прыметнік** (я к і? я к а я? я к о е? я к і я?)

ж. р.
**вялік** **ая** рака

м. р.
**вялік** **і** дуб

н. р.
**вялік** **ае** возера

адз. л.
**вялікая** рака — мн. л. **вялік** **ія** рэкі

адз. л.
**лясное** возера — мн. л. **лясн** **ыя** азёры

я к і?
**Вялікі** дуб рос на ўскрайку лесу.

**1.** Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі, каб атрымаліся правільныя выказванні.

Прыметнік у сказе звычайна адносіцца да *(назоўніка/дзеяслова)* і стаіць *(у/не ў)* тым родзе, ліку, што і назоўнік.

Прыметнікі змяняюцца па *(часах/ліках)*.

Прыметнікі змяняюцца па родах у *(множным/адзіночным)* ліку.



Правообладатель Национальный институт образования

**2.** Прачытайце. Далучыце прыметнікі да назоўнікаў. Запішыце спалучэнні слоў, дапісваючы патрэбныя канчаткі прыметнікаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| **ціх..** | *ранак*<br>*раніца*<br>*світанне*<br>*вечары́* | **зімов..** | *адзенне*<br>*вопратка*<br>*касцюм*<br>*боты* |

Вызначце род і лік прыметнікаў. Назавіце блізкія па значэнні назоўнікі.

Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі спалучэннямі слоў.

Узышло сонейка. Наступіла марозная … … . На вуліцу выбеглі дзеці ў рознакаляровым … … .

**3.** Прачытайце сказы, ужываючы словы ў дужках у патрэбнай форме.

1. Дзядуля прывёў Веру і Віцю ў *(зімовы)* лес. 2. *(Зімовы)* лес зачараваў іх сваёй загадкавасцю. 3. У *(зімовы)* лесе панавалі цішыня і спакой. 4. Дзеці ніколі не бачылі такога прыгожага *(зімовы)* лесу. 5. Усхваляваныя ўнукі доўга любаваліся *(зімовы)* лесам. 6. На развітанне яны ціхенька праспявалі калыханку *(зімовы)* лесу.

Вусна вызначце склон назоўніка *лес* у кожным сказе. Пастаўце пытанне ад назоўніка *лес* да прыметніка, які да яго адносіцца.

Выпішыце са сказаў назоўнік *лес* разам з прыметнікам *зімовы* ў наступнай паслядоўнасці.



Правообладатель Национальный институт образования

**Н.** лес (я к і?) зімовы
**Р.** лесу (я к о г а?) ...
**Д.** лесу (я к о м у?) ...
**В.** у лес (я к і?) ...
**Т.** лесам (я к і м?) ...
**М.** у лесе (я к і м?) ...

У якім родзе і ліку ўжыты ў сказах прыметнік *зімовы*?

**?!** У якіх склонах ужыта ў сказах слова *зімовы*? Ад чаго залежыць склон прыметніка?

**Прыметнікі змяняюцца па склонах. Прыметнікі стаяць у тым жа склоне, што і назоўнікі, да якіх яны адносяцца.**

**4.** Разгледзьце табліцу скланення прыметніка. Параўнайце канчаткі прыметніка ў розных склонах і канчаткі склонавых пытанняў.

| | | |
|---|---|---|
| **Назоўны** | **я к і?** | *глух[і] (лес)* |
| **Родны** | **я к о г а?** | *глух[ога] (лесу)* |
| **Давальны** | **я к о м у?** | *глух[ому] (лесу)* |
| **Вінавальны** | **я к і?** | *глух[і] (лес)* |
| **Творны** | **я к і м?** | *глух[ім] (лесам)* |
| **Месны** | **я к і м?** | *(у) глух[ім] (лесе)* |

**?!** Што падказваюць канчаткі склонавых пытанняў?



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Прачытайце тэкст. Якія птушкі застаюцца зімаваць у Беларусі? Чаму тэкст мае такую назву? Якія словы дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце?

## Птушкі-кветкі

Птушак, што застаюцца зімаваць у Беларусі, зусім няшмат.

Сарока-белабока жыве ў лесе і ў горадзе. Яна любіць патрашчаць там і тут. А вось **рознакаляровая** сойка з **блакітным** пер'ем на крылах не любіць паказвацца людзям на вочы.

**Сапраўдным** каралём **яловага** лесу з'яўляецца крыжадзюб. **Невялікая чырвоная** птушка мае **моцную** дзюбу. Палавіны дзюбы на канцы перакрыжоўваюцца. Галоўная ежа крыжадзюбаў — насенне елак і сосен. Крыжадзюбіха пачынае выседжваць птушанят у маразы.

Зімуюць з намі і снегіры. Хто не любаваўся іх чародкамі на дрэвах! *(Паводле А. Жука.)*



Выпішыце выдзеленыя прыметнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Вусна пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў. Вызначце род, лік і склон прыметнікаў.

ж. р., адз. л., Н.
Узор: *Рознакаляровая сойка, ...*



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна яе вымаўляць.

Белы бусел ба́яў байку беламу зайку.

Запішыце скорагаворку па памяці. Абазначце, якой часцінай мовы з’яўляецца кожнае слова ў сказе. Вызначце род, лік і склон прыметніка ў скорагаворцы.

**7.** Дапоўніце сказы прыметнікамі, якія падыходзяць па сэнсе. Як называюцца прыметнікі ў дужках?

1. *(старажытны, даўнішні)* Бабуля расказала ўнукам ... паданне. Сяргейка ўспомніў ... прыгоду ў летнім лагеры.
2. *(росны, мокры)* Матуля высушыла ... адзенне. Раніцай Аленка прабеглася па ... траве.
3. *(марозны, свежы)* З возера дзьмуў ... ветрык. Цёплая вясна змяніла ... зіму.
4. *(ясны, бясхмарны)* З ... неба свеціць яркае сонца. За акном разгараецца ... дзень.

Вызначце лік, род і склон прыметнікаў у сказах.

**8.** Спішыце тэкст. Устаўце ў словы патрэбныя літары.

### Зімовым надвячоркам

Зімовы дзень канчаецца. Вогненны шар сонца кі́дае на халодную зямлю ра*(з/с)*вітальны прамень. Прамень падае на хваінку, што пакрылася коркай лёду. Хваінка раптам загараецца яркай зорачкай у снежнай белізне. Зорачка ў*(з/с)*пыхвае і зараз жа *(з/с)*гасае.

Знайдзіце ў тэксце прыметнікі. Вызначце іх род, лік і склон.


Правообладатель Национальный институт образования

## Скланенне прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду

### Канчаткі прыметнікаў у назоўным і вінавальным склонах

**9.** Разгледзьце табліцу скланення прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду.

| Склоны | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| Н. | які?<br>якое? | *жыв[ы] прыгож[ы] сін[і] кіт (агонь)* (м. р.)<br>*жыв[ое] прыгож[ае] сін[яе] святло* (н. р.) |
| Р. | якога? | *жыв[ога] прыгож[ага] сін[яга] кіта (агню)*<br>*жыв[ога] прыгож[ага] сін[яга] святла* |
| Д. | якому? | *жыв[ому] прыгож[аму] сін[яму] кіту (агню)*<br>*жыв[ому] прыгож[аму] сін[яму] святлу* |
| В. | якога?<br>які?<br>якое? | *жыв[ога] прыгож[ага] сін[яга] кіта*<br>*жыв[ы] прыгож[ы] сін[і] агонь*<br>*жыв[ое] прыгож[ае] сін[яе] святло* |
| Т. | якім? | *жыв[ым] прыгож[ым] сін[ім] кітом (агнём)*<br>*жыв[ым] прыгож[ым] сін[ім] святлом* |
| М. | якім? | *(аб) жыв[ым] прыгож[ым] сін[ім] кіце (агні)*<br>*(аб) жыв[ым] прыгож[ым] сін[ім] святле* |

Параўнайце канчаткі прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду. **?!** У якіх склонах прыметнікі ніякага роду маюць тыя ж канчаткі, што і прыметнікі мужчынскага роду?



Правообладатель Национальный институт образования

**?!** У якіх склонах канчаткі прыметнікаў ніякага роду адрозніваюцца ад канчаткаў прыметнікаў мужчынскага роду?

Якія канчаткі маюць прыметнікі мужчынскага і ніякага роду ў творным і месным склонах?

**10.** Спішыце сказы. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік.

1. На гары стаяў вялікі старажытны замак. Вучні ўбачылі вялікі старажытны замак.

2. Каля кошкі скакала малое кацяня. Бацькі падарылі Алесі малое кацяня.

3. Сіняе неба пакрывалася хмаркамі. Хмаркі пакрывалі сіняе неба.

4. Пасярод парку раскінулася прыгожае возера. Мы любім гэта прыгожае возера.

Вызначце склон прыметнікаў. Выдзеліце канчаткі і падкрэсліце апошнюю літару асновы. Які гук яна абазначае? Абазначце ў прыметніках націск.

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі **ніякага** роду ў **назоўным** і **вінавальным** склонах маюць канчаткі ***-ое*** (пад націскам), ***-ае, -яе*** (не пад націскам).

Прыметнікі **мужчынскага** роду ў **назоўным** склоне маюць канчаткі ***-ы*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных), ***-і*** (пасля мяккіх зычных і ***г, к, х***). У **вінавальным** склоне яны маюць такія ж канчаткі, калі не абазначаюць прыметы жывых істот.



Правообладатель Национальный институт образования

**11.** Прачытайце. У якую пару́ года спяваюць гэту народную песню? Якія словы выкарыстоўваюцца ў песні для апісання жыта?

Юры, уставай рана,
адмыкай зямлю,
выпускай расу
на цёпл.. лета,
на буйн..́ жыта,
на ядраністае,
на каласі́ст..!

***я́драністае** — буйное, пругкае, сакавітае*

Знайдзіце ў сказе прыметнікі, вызначце іх род.

Спішыце верш, дапісваючы канчаткі прыметнікаў у вінавальным склоне.

Праспявайце вясновую песню-заклічку. Якія яшчэ народныя вясновыя песні вы ведаеце?

**12.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Урадзіўся ён высок..,
шаўкавіст.., сінявок.. .
Апранае нас здавён...
Здагадайцеся, хто ён.

*У. Мацвеенка.*



***здавён** — здаўна, з даўніх часоў*

Спішыце загадку, дапісваючы канчаткі прыметнікаў. Вызначце іх род, лік, склон.

**РМ** Раскажыце, што вырабляюць з лёну ў Беларусі.



Правообладатель Национальный институт образования

**13.** Вусна складзіце па падказках алгарытм выбару напісання канчаткаў прыметнікаў.

**1. Знаходзім у сказе ... .**

*Нарэшце ў гняздзе вывелася апошн.. мал.. пухнат..* ***птушаня.***

**2. Вызначаем ..., ..., ... назоўніка.**

***Птушаня*** (н. р., адз. л., Н.).

**3. Ставім пытанне да ... .**

*Птушаня* (я к о е?) ***апошн.. мал.. пухнат..*** .

**4. Калі канчатак**

**націскны, пішам...**

*птушаня* (я к о е?) *мал* ***óе***

**ненаціскны, пішам**

**пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных...**

*птушаня* (я к о е?) *пухнат* ***ае***

**пасля мяккіх зычных...**

**14.** Спішыце пары сказаў, дапісваючы патрэбныя канчаткі прыметнікаў. Вызначце іх род, лік і склон.

1. На беразе ракі рос высок.. малад.. клён. Каля дома лесніка дзеці ўбачылі высок.. малад.. клён.
2. Дзядуля расказаў унукам пра цікав.. здарэнне ў лесе. Цікав.. здарэнне надоўга запомнілася ўнукам.
3. Стаяла сух.. цёпл.. надвор'е. У сух.. цёпл.. надвор'е дзеці гулялі на вуліцы.



Правообладатель Национальный институт образования

## Канчаткі прыметнікаў у родным склоне

**15.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Работа ў **добрага** гаспадара заўсёды знойдзецца.
З **пустога** збана ніхто не нальe.
**Летняга** дня зімовым тыднем не заменіш.

Спішыце. Вызначце склон прыметнікаў. Абазначце канчаткі ў выдзеленых прыметніках і падкрэсліце апошнюю літару асновы. Які гук яна абазначае? Абазначце ў прыметніках націск.

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі **мужчынскага** і **ніякага** роду ў **родным** склоне маюць наступныя канчаткі:

- пад націскам — ***-ога***;
- не пад націскам — ***-ага*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных), ***-яга*** (пасля мяккіх зычных).

**16.** Замяніце літару ў канцы слова так, каб атрымалася новае слова. Падбярыце да кожнага назоўніка прыметнік.

Сом — ...





*рачны*

*прыемны*

Дапоўніце сказы спалучэннямі слоў, якія ў вас атрымаліся.

1. ... ... бывае вялікіх памераў. Тата злавіў ... ... . На верхняй губе ў ... ... ёсць доўгія ву́сы.

2. ... ... заўсёды падымае настрой. Хлопчык бачыў ... ... . Мама пажадала дзіцяці ... ... .

Вызначце склон прыметнікаў мужчынскага роду.



Правообладатель Национальный институт образования

**Завяжы вузялок!**

У **родным** і **вінавальным** склонах канчаткі прыметнікаў мужчынскага роду супадаюць, калі прыметнікі абазначаюць прыметы жывых істот.

**17.** Прачытайце спалучэнні слоў. Замяніце прыметнікі на супрацьлеглыя па значэнні.

Дрэннага гаспадара, зімовага надвор'я.

Дапоўніце сказы спалучэннямі слоў, якія атрымаліся.

1. У … … усе рэчы ляжаць на сваіх месцах. 2. Маленькае шчаня шукае … … . 3. Сонечныя дні і цёплы дожджык — прыметы … … .

Запішыце сказы. Вызначце род і склон устаўленых прыметнікаў, выдзеліце канчаткі.

**18.** Да назоўнікаў з левага слупка падбярыце пары слоў з правага слупка. Запішыце спалучэнні слоў па ўзоры. Вызначце род і склон прыметнікаў, выдзеліце канчаткі.

| | |
|---|---|
| галіна | маленьк.. памочніка |
| дах | раскідзіст.. дуба |
| гладзь | лясн.. возера |
| справа | суседн.. дома |

***памо́чнік***

м. р., Р.

Узор: *Галіна раскідзіст*[*ага*] *дуба, …*

**Гаварыце правільна!**

старо́га, ро́днага, мале́нькага



Правообладатель Национальный институт образования

**19.** Прачытайце сказы. Размясціце іх у такой паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Моцнай дзюбай прабівае ён кару **вялік..** дрэва. Пад карой **лясн..** доктар адшуквае **маленьк..** шкодніка і знішчае яго. Без **добр..** дзятла не выжыве ні адно дрэва ў лесе. Ад **чорненьк..** вока гэтай птушкі не схавацца шкоднікам!

Запішыце тэкст, дапісваючы канчаткі выдзеленых прыметнікаў. Вызначце склон гэтых прыметнікаў.

## Канчаткі прыметнікаў у давальным склоне

**20.** Прачытайце прыказкі. Якая з іх услаўляе ўважлівых, чулых, добразычлівых людзей?

1. Людскому воку ўсё відаць. 2. Апошняму госцю ці многа, ці нічога. 3. Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць.

Спішыце. Знайдзіце ў сказах прыметнікі ў давальным склоне і вызначце ў іх канчаткі. Пастаўце націск у гэтых прыметніках. Падкрэсліце апошнюю літару асновы. Які гук яна абазначае?

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі **мужчынскага** і **ніякага** роду ў **давальным** склоне маюць канчаткі:

- пад націскам — ***-ому***;
- не пад націскам — ***-аму*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных), ***-яму*** (пасля мяккіх зычных).



Правообладатель Национальный институт образования

**21.** Прачытайце скорагаворку і навучыцеся правільна яе вымаўляць.

Злому ветру голы клён
гнутка кланяўся сем дзён.
Зліцца вецер перастаў —
клён і кланяцца не стаў.
*С. Шах.*

***гну́тка кла́няўся*** — тут: *лёгка гнуўся*

Знайдзіце ў скорагаворцы прыметнік у давальным склоне. Выпішыце яго разам з назоўнікам, да якога ён адносіцца. Выдзеліце канчатак у прыметніку.

**Рм** Які вецер называюць злым? Выберыце словы, якімі можна апісаць такі вецер: *марозны, халодны, свежы, цёплы, моцны, паўночны, сцюдзёны, ледзяны, слабы, лагодны.*

**22.** Пастаўце прыметнікі ў форму давальнага склону. Запішыце спалучэнні слоў.

Радуюцца *(летняе)* цяплу, ішлі насустрач *(моцны)* ветру, удзячны *(лепшы)* сябру, дапамог *(стары́)* чалавеку, уручылі *(шаноўны)* ветэрану, зрабіў *(родны)* брату, узрадавалася *(лішні)* білету.

Выдзеліце канчаткі ў прыметніках. Растлумачце іх правапіс.

З адным спалучэннем слоў складзіце і запішыце сказ. Падкрэсліце ў сказе дзейнік і выказнік.

**Гаварыце правільна!**

старо́му, ро́днаму, мале́нькаму



Правообладатель Национальный институт образования

**23.** Прачытайце спалучэнні слоў. Замяніце прыметнікі на супрацьлеглыя па значэнні.

Халоднаму дню, маленькаму веласіпеду, старому чалавеку.

Дапоўніце сказы спалучэннямі слоў, якія атрымаліся.

1. Людзі радаваліся ... ... . 2. Дзядуля шчыра падзякаваў ... ... . 3. ... ... знайшлося месца ў та́тавым гаражы.

Запішыце сказы. Вызначце род і склон устаўленых прыметнікаў, выдзеліце канчаткі.

**24.** Выберыце правільнае выказванне і прадоўжыце яго.

У спалучэннях слоў **вялік.. возеру** і **вялік.. дому** прыметнік

а) мае розныя канчаткі, таму што ... .

б) мае аднолькавыя канчаткі, таму што ... .

**25.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Змяніце, калі неабходна, формы слоў.

1) Мама, прачытала, маленькі, сын, кніжку, цікавую; 2) Валя, даравала, крыўда, сябар, верны; 3) бабуля, падзякавала, любімы, унук, дапамога, за; 4) птушкі, радаваліся, сонца, вясенняе; 5) расказала, Аленка, брат, малодшы, гісторыю, незвычайную; 6) дзеці, вельмі, узрадаваліся, госць, дарагі.

Знайдзіце ў сказах прыметнікі ў давальным склоне. Вызначце іх род, выдзеліце канчаткі.



Правообладатель Национальный институт образования

## Канчаткі прыметнікаў у творным і месным склонах



**26.** Прачытайце скорагаворкі і навучыцеся правільна іх вымаўляць.

1. З жоўтым кошыкам — то Жанна, а з аранжавым — Мар'яна. *(С. Шах.)* 2. Над плотам барбарыс колкім веццем звіс. *(С. Шах.)*

Спішыце. Знайдзіце ў сказах прыметнікі ў творным склоне і выдзеліце ў іх канчаткі. Падкрэсліце апошнюю літару асновы. Які гук яна абазначае?

**27.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

1. У **родным** лесе і куст родны. 2. За **агульным** сталом яда смачнейшая.

Вызначце склон выдзеленых прыметнікаў. Назавіце іх канчаткі.

?! Як адрозніць прыметнікі творнага і меснага склонаў?

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі **мужчынскага** і **ніякага** роду ў **творным** і **месным** склонах маюць аднолькавыя канчаткі: ***-ым*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных); ***-ім*** (пасля мяккіх зычных).

Прыметнікі творнага і меснага склонаў трэба адрозніваць па назоўніках, да якіх яны адносяцца.



Правообладатель Национальный институт образования

**28.** Спішыце. Выдзеліце канчаткі ў прыметніках і вызначце іх склон.

Гулялі ў яловым лесе, напаіла смачным кампотам, сустрэўся з суседскім хлапчуком, ляціць у сінім небе, пакрылася белым снегам, сядзеў на высокім дрэве, спыніліся на рачным беразе, растуць на зялёным лузе.

**29.** Прачытайце спалучэнні слоў. Замяніце прыметнікі на супрацьлеглыя па значэнні.

Нясмачным малаком, на цвёрдым крэсле, з сумным настроем.

Дапоўніце сказы спалучэннямі слоў, якія атрымаліся.

1. Бабуля пачаставала ўнучку ... ... . 2. Дзед сядзеў на ... ... перад тэлевізарам. 3. Сяргейка вяртаўся з заапарка з ... ... .

Запішыце сказы. Вызначце род і склон прыметнікаў, выдзеліце канчаткі.

**30.** Выберыце правільнае выказванне і прадоўжыце яго.

У спалучэннях слоў **у родн.. доме** і **над родн.. домам** прыметнік

а) мае розныя канчаткі, таму што ... .

б) мае аднолькавыя канчаткі, таму што ... .

**Гаварыце правільна!**

стары́м, ро́дным, мале́нькім



Правообладатель Национальный институт образования

**31.** Дапоўніце сказы прыметнікам *сасновы* ў патрэбным склоне. Запішыце.

1. ... бор зачароўвае сваёй прыгажосцю. 2. Дзядуля не адрываў вачэй ад ... бору. 3. Птушкі спяваюць прыгожыя песні ... бору. 4. Кожную раніцу хлопчык любуецца ... борам. 5. Дзеці часта гуляюць у ... бары. 6. Падарожнікі трапілі ў ... бор.

Вызначце род і склон прыметніка *сасновы* ў сказах. Выдзеліце канчаткі.

## Скланенне прыметнікаў жаночага роду

### Канчаткі прыметнікаў у назоўным склоне

**32.** Разгледзьце табліцу скланення прыметнікаў жаночага роду.

| Склоны | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| **Н.** | якая? | ***жыв ая прыгож ая сін яя*** *кветка* |
| **Р.** | якой? | ***жыв ой прыгож ай сін яй*** *кветкі* |
| **Д.** | якой? | ***жыв ой прыгож ай сін яй*** *кветцы* |
| **В.** | якую? | ***жыв ую прыгож ую сін юю*** *кветку* |
| **Т.** | якой? | ***жыв ой прыгож ай сін яй*** *кветкай* |
| **М.** | якой? | *(на)* ***жыв ой прыгож ай сін яй*** *кветцы* |

Параўнайце канчаткі прыметнікаў у розных склонах.

**?!** У якіх склонах прыметнікі жаночага роду адказваюць на адны і тыя ж пытанні і маюць аднолькавыя канчаткі?



Правообладатель Национальный институт образования

**33.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў сказах прыметнікі жаночага роду. Вызначце іх склон.

Бабуля з Дашай ідуць па лясной сцяжынцы. Дзяўчынка адчувае сябе сапраўднай падарожніцай. Маленькая сцежка пятляе між дрэў і кустоў. Бабуля расказвае пра іх любімай унучцы. Раптам Даша заўважае сонечную палянку і спыняецца ад вялікай нечаканасці. Увагу дзяўчынкі прыцягвае сіняя кветка. Бабуля пазнае́ ў вясновай кветцы пралеску.

Спішыце сказы, у якіх ёсць прыметнікі жаночага роду ў назоўным склоне.

**?!** Якія канчаткі маюць прыметнікі жаночага роду ў назоўным склоне?

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі **жаночага** роду ў **назоўным** склоне маюць канчаткі: ***-ая*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных); ***-яя*** (пасля мяккіх зычных).

**34.** Адгадайце загадку. Вызначце род, лік і склон прыметнікаў. Спішыце загадку. Дапішыце патрэбныя канчаткі прыметнікаў.



І заморск.. птушка
паўднёв..,
і пячаць на паперы
лілов.. .

*У. Мацвеенка.*





Што яшчэ называецца словам *грыф*? Знайдзіце патрэбныя звесткі ў тлумачальным слоўніку або ў інтэрнэце.



Правообладатель Национальный институт образования

## Будзьце ўважлівыя!

Канчаткі прыметнікаў **адзіночнага ліку** ў назоўным склоне

| **жаночы род** | **ніякі род** |
| --- | --- |
| ***-ая***, ***-яя*** | ***-ае***, ***-ое***, ***-яе*** |

**35.** Прачытайце загадкі. З «рассыпаных» літар складзіце словы-адгадкі.

1. Трапяткая прастора —
цёмна-сіняе мора,
як жывое, да рання
ўсё пульсуе ад ззяння.
*С. Шах.*

*е р н а з е а н о б*

*а с н с а*

2. Кудлатая, калючая,
высокая, рыпучая.
Што восень, што вясна —
зялёная … .
*С. Шах.*

***ззяць***

***трапятка́я** — якая пастаянна варушыцца, дрыжыць.*

Назавіце прыметнікі, якія дапамаглі знайсці адгадкі. Вызначце іх род.

Спішыце другую загадку. Вызначце склон прыметнікаў. Выдзеліце ў іх канчаткі.

Выпішыце з першай загадкі слова, аднакаранёвае да слоўнікавага.


Правообладатель Национальный институт образования

**36.** Прачытайце. Пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў. Вызначце род прыметнікаў.

Цёпл.. раніца, вялік.. радасць, сін.. паліто, сін.. кветка, апошн.. кніга, вялік.. дрэва, цёпл.. малако, апошн.. заданне.

Запішыце спалучэнні слоў у два слупкі па ўзоры.

У з о р:

| ж. р. | н. р. |
|---|---|
| я к а я? | я к о е? |
| *цёпл*[*ая*] *раніца* | *апошн*[*яе*] *заданне* |
| … | … |

Выдзеліце канчаткі ў прыметніках. Вызначце склон прыметнікаў жаночага роду.

**37.** Спішыце тэкст, дапісваючы канчаткі прыметнікаў.

**Лясн..** возера на досвітку дыхае прахалодай. **Чорн.. нерухом..** вада нагадвае люстэрка. **Веснав..** ноч неахвотна здае ранку свае пазіцыі. Наўкол заспявалі шматлікія лясныя птушкі. Пабегла ў нару з палявання **хітр..** ліска. Стаіўся ў хвойнічку заяц. Нарэшце **зялён..** голле дрэў асвяцілася залатымі промнямі. Узышло **веснав..** сонца. *(Паводле Р. Ігнаценкі.)*



***до́світак*** — *час перад світаннем*

Вызначце род і склон выдзеленых прыметнікаў.



Правообладатель Национальный институт образования

## Канчаткі прыметнікаў у родным, давальным, творным і месным склонах

**38.** Вусна дапоўніце сказы спалучэннем слоў *цёплая сухая ранняя вясна* ў патрэбнай форме.

1. Даўно не было такой … … … … . 2. Людзі радуюцца … … … … . 3. … … … … звонка спяваюць птушкі. 4. Халоднай зімой мы марылі аб … … … … .

Запішыце гэта спалучэнне слоў у родным, давальным, творным і месным склонах. Выдзеліце канчаткі ў прыметніках.

Узор: Р. *вясны* (якой?) *цёпл*|*ай*|, *сух*|*ой*|, *ранн*|*яй*|
Д. *вясне* (якой?) … … …
Т. *вясной* (якой?) … … …
М. *аб вясне* (якой?) … … …

На якія пытанні адказваюць прыметнікі жаночага роду ў родным, давальным, творным і месным склонах? Пастаўце ў прыметніках націск. Падкрэсліце апошнюю літару асновы. Які гук яна абазначае?

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі жаночага роду ў **родным, давальным, творным** і **месным** склонах маюць наступныя канчаткі:

- пад націскам — ***-ой***;
- не пад націскам — ***-ай*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных), ***-яй*** (пасля мяккіх зычных).

Прыметнікі ў родным, давальным, творным і месным склонах трэба адрозніваць па назоўніках, да якіх яны адносяцца.


Правообладатель Национальный институт образования

**39.** Прачытайце. Адгадайце загадку.



> У **хвойнай** засені **лясной**,
> у траве **густой**
> ён знайшоў сабе зацішак,
> гэты вабны … .
>
> *С. Шах.*

***за́сень, за́цень** — заце́ненае месца*

Да якіх назоўнікаў адносяцца выдзеленыя прыметнікі? Вызначце род і склон гэтых прыметнікаў.

**Гаварыце правільна!**

старо́й, ро́днай, мале́нькай
веснаво́й, вясно́вай

**40.** Прачытайце тэкст. Чаму фіялка адчула сябе самай шчаслівай? Вызначце тып тэксту.



## Фіялка

Увесну пад **стар..** ліпай расцвіла **маленьк..** фіялка. Яна з цікавасцю паглядзела навокал. Усе яе суседкі былі яркія і высокія. Над імі кружыліся матылькі. Толькі да **маленьк..** кветкі ніхто не прылятаў. Фіялка самотна цвіла ў **густ..** траве.

Раптам яна пачула **прыемн..** гудзенне. Гэта пчала закружылася над ёю. Пчала дакранулася да кветкі, узяла кропельку нектару, паляцела ў вулей.



Правообладатель Национальный институт образования

**Маленьк..** фіялка пышна расцвіла. Яна адчула сябе самай шчаслівай на **вяснов..** зямлі. *(Паводле К. Каліны.)*

Выпішыце выдзеленыя прыметнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Дапішыце патрэбныя канчаткі. Вызначце род і склон прыметнікаў.

**41.** Прачытайце верш. Што можна прыгатаваць у чыгунку́?

**Чыгунок**

Чорны, чорны чыгунок
грэўся ў печцы нашай.
Чорны, чорны чыгунок —
ды з **духмянай** кашай.
З **рысавай** ці **ячнаю** —
**сытнаю** і **смачнаю**?
А магчыма, з бабкаю,
з пульхнымі аладкамі?

*Т. Мушынская.*



***я́чная*** — *ячменная, прыгатаваная з зерня ячме́ню*

Вызначце род і склон выдзеленых прыметнікаў. Дапішыце іх у спалучэнні. Выдзеліце канчаткі.

з кашай (я к о й? ) …, …
з кашай (я к о ю?) …, …, …

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі жаночага роду ў **творным** склоне маюць варыянты канчаткаў: ***-ой (-ою); -ай (-аю), -яй (-яю).***



Правообладатель Национальный институт образования

**42.** Прачытайце. Пастаўце словы ў дужках у патрэбную форму і запішыце. Абазначце склон прыметнікаў. Выдзеліце канчаткі.

Стаіць каля *(вялікая плошча)*, купаецца ў *(шырокая рака)*, пачаставаў *(салодкая груша)*, дапамог *(любімая матуля)*, расцвіў у *(густая трава)*, прыселі перад *(дальняя дарога)*.

Падкрэсліце словы, у якіх магчымы варыянты канчаткаў. З адным спалучэннем слоў вусна складзіце сказ.

**43.** Спішыце тэкст, дапісваючы канчаткі прыметнікаў. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

Стаіць ранн.. вясна. З-за калмат.. хмары на хвіліну выгляне сонца і зноў схаваецца.

Ноччу падмарозіла. Лужыны пакрыліся тонк.. скарынкай лёду. Яна звонка трэскаецца пад нагамі асядае ў мутн.. ваду.

У лесе пахне леташн.. лістотай сыр.. карой. У невялік.. азярыне цвіце жоўт.. лотаць. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

***ло́таць*** — *травяністая расліна з жоўтымі кветкамі, якая расце на балотах, берагах сажалак;* рус. *калужница*
***азяры́на*** — *невялікае возера*

Вызначце род і склон прыметнікаў.


Правообладатель Национальный институт образования

## Канчаткі прыметнікаў у вінавальным склоне

**44.** Прачытайце спалучэнні слоў. Назавіце канчаткі прыметнікаў. Вусна вызначце род і склон прыметнікаў.

Невялікую дзяўчынку, светлую раніцу, нешырокую раку.

Замяніце прыметнікі на блізкія па значэнні. Дапоўніце сказы спалучэннямі слоў, якія атрымаліся.

1. Дзеці сустрэлі ў двары … … . 2. Птушкі вітаюць … … радасным спевам. 3. Хлопчыкі ўбачылі за лесам … … .

Запішыце сказы. Ва ўстаўленых прыметніках выдзеліце канчаткі, падкрэсліце апошні гук асновы.

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі жаночага роду ў **вінавальным** склоне маюць канчатак ***-ую*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных); ***-юю*** (пасля мяккіх).

**45.** Замяніце літару ў сярэдзіне слова так, каб атрымалася новае слова. Падбярыце да кожнага назоўніка адпаведны прыметнік.

Вата — …





*салодкая*

*халодная*



Правообладатель Национальный институт образования

Дапоўніце сказы спалучэннямі слоў, якія ў вас атрымаліся.

1. У спёку Віця часта п'е … … . Бабуля ніколі не палівае кветкі … … .

2. Многія дзеці любяць … … . У парку сябры частаваліся … … .

Спішыце. Знайдзіце ў сказах прыметнікі жаночага роду. Вызначце іх склон, абазначце канчаткі.

**Будзьце ўважлівыя!**

Канчаткі прыметнікаў жаночага роду

| ў **творным** склоне | ў **вінавальным** склоне |
|---|---|
| *-ай*, *-аю* | *-ую* |
| *-ой*, *-ою* | *-юю* |
| *-яй*, *-яю* | |

**46.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.



Ціха на зямлю апускаецца ноч. Усё заціхае. Птушкі перасталі спяваць. Край неба блішчыць шырок.. чырвон.. стужкаю.

Тонкія, лёгкія хмаркі афарбаваліся ў залаты колер, усё роўна як абняло іх полымя. Белават.. плёнкаю ўздымаецца туман над лугамі і балотамі.

А цемната ўсё гусцее і гусцее. Яна закрывае ад вачэй і поле, і лес. Вось узышла ўжо вячэрн.. зорка.


Правообладатель Национальный институт образования

За лесам яснее. Гэта круглы месячык запаліў ліхтарык і пачаў асвятляць чорн.. зямлю. *(Паводле Якуба Коласа.)*

Пастаўце пытанні ад назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку да прыметнікаў. Выпішыце гэтыя спалучэнні слоў разам з пытаннямі. Дапішыце патрэбныя канчаткі. Вызначце склон прыметнікаў.

т.

У з о р: *Стужкаю* (я к о ю?) *шырокаю*, ...

**Рм** Назавіце прыметнікі і дзеясловы, якія дапамагаюць апісаць ноч. Вусна стварыце ўласнае апісанне ночы з апорай на малюнак. Выкарыстайце запісаныя спалучэнні слоў.

**47.** Прачытайце прыказкі. Прыметнікі ў дужках пастаўце ў патрэбную форму. Чаму так гавораць?

1. За *(разумная)* галавою і рукам лёгка. 2. Родная зямля мякчэйшая за *(чужая)* пярыну.

Спішыце. Вызначце склон прыметнікаў, абазначце канчаткі.

**48.** Прачытайце. Вызначце склон прыметнікаў.

1. Над сонн.. зямлёю зазвінеў птушыны спеў. 2. Марынка ўбачыла на лузе вялік.. страказу. 3. Дзеці залюбаваліся стракат.. птушкай. 4. Пад стар.. бярозай рос прыгожы падбярозавік. 5. Дзяўчынка апранула сін.. сукенку. 6. Пад высок.. елкай было шмат шышак. 7. Прыемна гуляць па лесе сонечн.. веснав.. раніцай.

Спішыце сказы, дапісваючы канчаткі прыметнікаў. Падкрэсліце назоўнікі і прыметнікі, у якіх магчымы варыянты канчаткаў.



Правообладатель Национальный институт образования

## Скланенне прыметнікаў множнага ліку

### Канчаткі прыметнікаў у назоўным і вінавальным склонах

**49.** Разгледзьце табліцу скланення прыметнікаў множнага ліку.

| Склоны | Пытанні | Прыклады |
|---|---|---|
| **Н.** | які я? | *дараг\|ія\| добр\|ыя\| сябры (словы)* |
| **Р.** | які х? | *дараг\|іх\| добр\|ых\| сяброў (слоў)* |
| **Д.** | які м? | *дараг\|ім\| добр\|ым\| сябрам (словам)* |
| **В.** | які х?<br>які я? | *дараг\|іх\| добр\|ых\| сяброў*<br>*дараг\|ія\| добр\|ыя\| словы* |
| **Т.** | які мі? | *дараг\|імі\| добр\|ымі\| сябрамі (словамі)* |
| **М.** | які х? | *(пры) дараг\|іх\| добр\|ых\| сябрах (словах)* |

Параўнайце канчаткі прыметнікаў множнага ліку ў розных склонах.

**?!** У якіх склонах прыметнікі множнага ліку адказваюць на адны і тыя ж пытанні і маюць аднолькавыя канчаткі?

**?!** Як вы думаеце, ад чаго залежыць выбар канчаткаў прыметнікаў у вінавальным склоне?

**50.** Спішыце сказы. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік. Вусна пастаўце пытанні да дадзеных членаў сказа.

1. Падраслі маладыя дрэўцы. Дзеці садзяць маладыя дрэўцы.


Правообладатель Национальный институт образования

2. Зацвілі сінія васількі. У жыце дзяўчынка ўбачыла сінія васількі.

Вызначце склон прыметнікаў множнага ліку. Выдзеліце ў іх канчаткі. На якое пытанне адказваюць назоўнікі, да якіх адносяцца гэтыя прыметнікі?

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі множнага ліку ў **назоўным** склоне маюць канчаткі: ***-ыя*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных); ***-ія*** (пасля мяккіх зычных).

У **назоўным** і **вінавальным** склонах канчаткі прыметнікаў множнага ліку супадаюць, калі прыметнікі не абазначаюць прыметы жывых істот.

**51.** Прачытайце верш. Чым прывабліваюць людзей пралескі?

### Пралеска



Яна пад коўдраю зімоваю
даўно прачнулася, расла,
як неба, фарбы васільковыя
на ўцеху нам усім знайшла.

І кожны год парою ве́сняю
дзіўлюся з мілае красы.
Пралеска! Матчынаю песняю
чаруюць родныя лясы.

*Э. Агняцвет.*

Выпішыце сказы, у якіх ёсць прыметнікі множнага ліку. Вызначце склон прыметнікаў.



Правообладатель Национальный институт образования

**52.** Прачытайце тэкст. На каго падобныя грыбы ў апавяданні? Якія словы ў тэксце дапамаглі ўявіць грыбы жывымі істотамі?

## Грыбная сямейка

У лесе пад бярозай я знайшоў сямейку баравікоў.

Пасярэдзіне раслі два вялікія стары́я грыбы. Гэта дзед і баба.



Вакол дзеда і бабы стаялі **малад..** грыбы. Гэта іх сыны і дочкі, моцныя, крамяныя, з карычневымі пругкімі шапкамі.

А па ўсёй палянцы рассыпаліся **малюсеньк..** грыбкі. Гэта ўнукі старых баравікоў.

Дзед-грыб, мабыць, перад маім прыходам прыкрыкнуў на ўнукаў: «Не вельмі, жэўжыкі, весяліцеся, вунь грыбнік ідзе». Баравічкі спалохаліся і схаваліся пад **сух.. бярозав..** лісцікі, прытаіліся. *(Паводле В. Хомчанкі.)*

***жэ́ўжык*** — *свавольнік, гарэза*
***крамя́ны*** — *цвёрды, сакавіты*

Выпішыце з тэксту сказы, у якіх ёсць выдзеленыя прыметнікі. Вызначце лік і склон прыметнікаў, дапішыце патрэбныя канчаткі.

**Рм** Калі звычайна ходзяць у грыбы? Ці збіралі вы калі-небудзь грыбы? Хто вас вучыў гэта рабіць? Як трэба правільна збіраць грыбы?


Правообладатель Национальный институт образования

**53.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Змяніце, калі неабходна, формы слоў.

1) Стары, і, гракі, малады, на, поле, збіраюць, зерне; 2) бабуля, каля, дом, розныя, кветкі, пасадзіла; 3) па, дарога, пабеглі, ручайкі, хуткі; 4) веснавы, сонейка, на, шле, зямлю, яркі, промні; 5) дажджавы, упалі, кроплі, на, зямлю, сухі; 6) па, возера, белыя, плылі, лебедзі; 7) цёплы, разагнаў, вецер, хмары, цёмны.

Вызначце склон прыметнікаў, выдзеліце ў іх канчаткі.

## Канчаткі прыметнікаў у родным і месным склонах

**54.** Спішыце сказы. Вызначце склон выдзеленых прыметнікаў, выдзеліце канчаткі.

1. Дзядуля нарваў яблыкаў для **вясёлых суседскіх** хлапчукоў. 2. Дзяніска сумаваў па **вясёлых суседскіх** хлапчуках. 3. Хутка Наташа заўважыла **вясёлых суседскіх** хлапчукоў.

Пастаўце пытанне да назоўніка, да якога адносяцца прыметнікі ў вінавальным склоне.

?! Калі ў прыметнікаў множнага ліку канчаткі вінавальнага склону супадаюць з канчаткамі роднага і меснага склонаў?

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі множнага ліку ў **родным** і **месным** склонах маюць канчаткі: ***-ых*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных); ***-іх*** (пасля мяккіх зычных).


Правообладатель Национальный институт образования

**У родным, месным і вінавальным** склонах канчаткі прыметнікаў множнага ліку супадаюць, калі прыметнікі абазначаюць прыметы жывых істот.

**55.** Прачытайце тэкст. Хто такія лесавік і палявік?

Ніхто іх не бачыў. **Жывуць яны ў старадаўн.. павер'ях ды ў чарадзейн.. казках.** Гэта непаўторныя вобразы, без якіх немагчыма ўявіць жыццё нашых продкаў.



Палявік — гаспадар поля. **У добрым настроі ён клапаціўся пра ўраджай адпужваў шкодн.. насякомых бярог пасевы.**



**Лесавік быў гаспадаром лесу і дзік.. жывёл.** Яго стараліся задобрыць. **Людзі пакідалі на лясн.. прасеках і вузк.. сцежках лустачку хлеба скрылік сала.** *(Паводле М. Маляўкі.)*

Выпішыце выдзеленыя сказы, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Выдзеліце канчаткі ў прыметніках множнага ліку. Абазначце іх склон.



Раскажыце пра іншых казачных істот, якіх шанавалі нашы продкі. Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў дарослых або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.



Правообладатель Национальный институт образования

**56.** Спішыце, ужываючы прыметнікі з назоўнікамі ў патрэбным склоне. Вызначце склон прыметнікаў.

Жывуць у *(яловыя лясы)*, паслухаў *(разумныя людзі)*, прыляцелі з *(далёкія краіны)*, ішоў па *(знаёмыя вуліцы)*, сумаваў без *(любімыя сваякі)*, убачыў *(верныя сябры)*, разносіцца па *(бяскрайнія прасторы)*.

**Гаварыце правільна!**

стары́х, ро́дных, мале́нькіх

***ву́ліца***

**57.** **Рм** Разгледзьце малюнкі. Складзіце вуснае апавяданне. Прыдумайце загаловак. Ужывайце прыметнікі з назоўнікамі ў множным ліку.









Словы для даведкі: *з маленькімі брацікамі, шмат высокіх сосен, беласнежных чаек, сасновых шышак, сухіх галінак, розных звяркоў, казачных чалавечкаў, для любімых брацікаў і для школьных сяброў.*

**Рм** Запішыце тэкст, які ў вас атрымаўся.



Правообладатель Национальный институт образования

**58.** Выберыце правільнае выказванне і прадоўжыце яго.

У спалучэннях слоў **шырок.. рэк** і **ў шырок.. палях** прыметнік

а) мае розныя канчаткі, таму што ... .
б) мае аднолькавыя канчаткі, таму што ... .

**59.** Запішыце сказы, ужываючы прыметнікі з назоўнікамі ў патрэбным склоне.

1. Сонейка купаецца ў *(празрыстыя лужыны)* на ўскрайку лесу. 2. Алесь заўважыў на дрэве *(незвычайныя птушкі)*. 3. У *(беларускія лясы)* растуць розныя па колеры баравікі. 4. Чуюцца спевы *(галасістыя шпакі)*. 5. Шчупакі адкладваюць ікру сярод зараснікаў *(вадзяныя расліны)*. 6. У Белавежскай пушчы дзеці ўбачылі *(розныя жывёлы)*.

Выдзеліце канчаткі ў прыметніках множнага ліку. Вызначце іх склон.

## Канчаткі прыметнікаў у давальным склоне

**60.** Спішыце сказы. Вусна пастаўце пытанні ад выдзеленых назоўнікаў да прыметнікаў. Выдзеліце канчаткі ў гэтых прыметніках, вызначце склон.

1. У Дзень Перамогі дзеці падарылі кветкі шаноўным **ветэранам**. 2. Ветэраны падзякавалі маленькім **вучням** за прыгожыя **кветкі.**


Правообладатель Национальный институт образования

**Завяжы вузялок!**

**У давальным** склоне прыметнікі множнага ліку маюць канчаткі ***-ым*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных); ***-ім*** (пасля мяккіх зычных).

**61.** Прачытайце. Што ўслаўляе паэтэса ў вершы?



Дзецям патрэбны і краскі, і горны,
сонца для ўсіх над зямлёю — адно.
І сінявокім, і жоўтым, і чорным
свеціць яно.

Будзе свяціць і зямлі, і зярнятам,
хвалям марск.. і рачулкам лясн..,
горн.. арлам і мал.. буслянятам,
толькі не жорстк.. ракетам сляпым.

*Э. Агняцвет.*

 ***горн*** *— медная сігнальная труба*

Выпішыце з другога слупка прыметнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Вызначце склон прыметнікаў.

**62.** Прачытайце прыказкі, ужываючы спалучэнні слоў у дужках у давальным склоне. Чаму так гавораць?

*(Добрыя людзі)* усюды добра. *(Разумныя людзі)* лёгка раіць.

Запішыце прыказкі. Выдзеліце канчаткі ў прыметніках.

**Гаварыце правільна!**

стары́м, ро́дным, мале́нькім



Правообладатель Национальный институт образования

**63.** Прачытайце спалучэнні слоў. На якія дзве групы іх можна размеркаваць?

Высок.. дама́м, высок.. домам; цёпл.. вечара́м, цёпл.. ве́чарам; драўлян.. сталам, драўлян.. сталом; блакітн.. нябёсам, блакітн.. небам; дзік.. звярам, дзік.. зверам.

Запішыце спалучэнні слоў у два слупкі. Дапішыце канчаткі прыметнікаў. Абазначце іх лік і склон.

**64.** Прачытайце сказы, ужываючы прыметнікі ў дужках у патрэбнай форме.

1. Людзі радаваліся *(птушыны)* спевам *(сонечны)* промням. 2. Ноччу зоркі ярка свяцілі *(вялікі)* дрэвам *(маленькі)* кветкам. 3. Дождж быў патрэбны *(малады)* раслінам. 4. Дзіма ганарыцца *(старэйшы)* братам. 5. Бабуля была ўдзячная *(любімы)* унукам. 6. Настаўніца сустрэлася з *(новы)* вучнем у калідоры школы.

Запішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Вызначце склон прыметнікаў, выдзеліце канчаткі.

## Канчаткі прыметнікаў у творным склоне

**65.** Прачытайце тэкст. Якая пара года ў ім апісана?

На ўзлеску мяне сустрэла чародка рабінак. Ад іх вачэй не адвесці. Макаўкі рабінак усыпаны белымі



Правообладатель Национальный институт образования

**кветкамі**. А каля пнёў залацістымі **суквеццямі** цвіў падбел.

У кучаравай кроне дуба шапацеў маладзенькімі **лісцікамі** вецер. Сінела чыстае, без аблачынак, неба. Лагодна прыгравала сонца. *(Паводле Я. Галубовіча.)*



***падбе́л*** — *лекавая расліна з шырокімі лістамі і жоўтымі кветкамі*; рус. *мать-и-мачеха*

Спішыце сказы, у якіх ёсць выдзеленыя словы. Вусна пастаўце пытанні ад выдзеленых назоўнікаў да прыметнікаў. Выдзеліце канчаткі ў гэтых прыметніках, вызначце склон.

***цвісці́***

**Завяжы вузялок!**

Прыметнікі множнага ліку ў **творным** склоне маюць канчаткі ***-ымі*** (пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных); ***-імі*** (пасля мяккіх зычных).

**66.** Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.

Ходзяць чуж.. нагамі,
мяч адбіваюць насамі.
*М. Пазнякоў.*

*ч р і а в і к а*

Запішыце загадку разам з адгадкай. Выдзеліце канчатак у прыметніку і абазначце склон.



Правообладатель Национальный институт образования

**67.** Падбярыце да схем спалучэнні слоў, якія ім адпавядаюць.

Родн.. горадам, родн.. гарадамі, родн.. гарадам; моцн.. ліўнем, моцн.. ліўням, моцны.. ліўнямі; лёгк.. рукзаком, лёгк.. рукзакамі, лёгк.. рукзакам.

| якімі? | якім? |
| --- | --- |
| прым. ← наз. | прым. ← наз. |
| ... | ... |

Запішыце спалучэнні слоў у два слупкі, дапісваючы канчаткі прыметнікаў. Вызначце іх лік і склон.

**?!** У якія слупкі вы запісалі спалучэнні слоў з прыметнікамі ў творным склоне? Чаму так атрымалася?

**Гаварыце правільна!**

стары́мі, ро́днымі, мале́нькімі

**68.** Прачытайце тэкст, ужываючы прыметнікі ў дужках у патрэбнай форме. Дайце назву тэксту.

У сярэдзіне лета лес усы́палі суніцы. *(Пунсовы яркі)* кроплямі зіхацяць ягады ў траве. Яны грэюць на сонцы *(круглы)* бачкі́ з *(жаўтаваты)* зярняткамі. Ягадкі клічуць цябе, просяць: «Мы паспелі, бяры нас».





Правообладатель Национальный институт образования

Вось тут кланяйся лесу. Тады ты напоўніш кошык *(спелы)* суніцамі. Чым ніжэй будзеш кланяцца, тым паўнейшы будзе кошык. *(Паводле В. Хомчанкі.)*

Выпішыце прыметнікі множнага ліку разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Выдзеліце канчаткі ў прыметніках, абазначце склон. Вусна растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**69.** Прачытайце верш. Якія канчаткі трэба дапісаць на месцы пропускаў? Вызначце род, лік, склон прыметнікаў.

**Ландыш**

Ландыш, ландыш,
ра**с**цвітай.
Пр**ы**гажосцю
вечн..
захапляй.
У л**я**сн..
духмян.. ціш**ы**ні
бел.. званочкамі звіні.
*М. Пазнякоў.*



Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**70.** Дапоўніце прыказкі спалучэннямі слоў з правага слупка ў форме творнага склону. Чаму так гавораць?

З … … добраму навучышся. | *салаўіныя песні*
… … не будзеш сыты. | *разумныя людзі*



Правообладатель Национальный институт образования

**71.** Прачытайце. Якое пачуццё да роднай зямлі перадае паэт у вершы?



### Палеская зямля

Раніца. Духмян.. паветра.
Задуменн.. пошчак салаўя.
**Бел..** туманамі адзета
**лю́б.. палеск..** зямля.

І не трэба мне **заморск..** пляжаў,
і не трэба мне **чуж..** краін,
бо такіх **прываблів..**, як нашы,
на зямлі не ведаю мясцін.

*С. Карыцька.*

***пошчак*** — *спеў*; рус. *трель*

Спішыце верш, дапісваючы патрэбныя канчаткі прыметнікаў. Вызначце склон выдзеленых прыметнікаў.

**Адкажыце на пытанні**

1. Назавіце склонавыя пытанні прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду. Што падказваюць канчаткі склонавых пытанняў?
2. У якіх склонах канчаткі прыметнікаў ніякага роду адрозніваюцца ад канчаткаў прыметнікаў мужчынскага роду?
3. Назавіце склонавыя пытанні прыметнікаў жаночага роду. Што падказваюць канчаткі склонавых пытанняў?


Правообладатель Национальный институт образования

4. У якіх склонах прыметнікі жаночага роду маюць аднолькавыя канчаткі?
5. У якім склоне прыметнікі жаночага роду маюць варыянты канчаткаў?
6. Назавіце склонавыя пытанні прыметнікаў множнага ліку. Што падказваюць канчаткі склонавых пытанняў?
7. У якіх склонах прыметнікі множнага ліку маюць аднолькавыя канчаткі?
8. Ад чаго залежыць выбар склонавых канчаткаў прыметнікаў множнага ліку ў вінавальным склоне?

*Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? Да якіх тэм трэба звярнуцца яшчэ раз, каб правільна адказаць на гэтыя пытанні?*



Уявіце, што ў класе праводзіцца канферэнцыя на тэму «Прыметнік у беларускай мове». Вам прапанавалі выступіць на гэтай канферэнцыі з дакладам. Падрыхтуйце паведамленне з прыкладамі на адну з наступных тэм: «Скланенне прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду», «Скланенне прыметнікаў жаночага роду», «Скланенне прыметнікаў множнага ліку». Карыстайцеся інфармацыяй, змешчанай на форзацах.

Правообладатель Национальный институт образования

# ЗАЙМЕННІК

## Займеннік як часціна мовы

**72.** Школу, у якой вучыцца Алесь, наведала дэлегацыя замежных вучняў. Прачытайце, што расказаў хлопчык гасцям, пра што запытаўся ў іх.



— **Я** вучуся ў чацвёртым класе. А ў якім класе вучышся **ты**?



— **Мы** любім гуляць у камп'ютарныя гульні. Якія гульні любіце **вы**?



— Гэта наша настаўніца Ганна Аляксееўна. **Яна** вельмі разумная, добрая і вясёлая. А гэта ваш настаўнік? Які **ён**?



Правообладатель Национальный институт образования



— Тут расце наша «дрэва сяброўства». **Яно** такое прыгожае, таму што ў нас шмат сяброў. Кожную стужку завязалі госці школы, якія з намі пасябравалі.



— Паглядзіце на прыгожых рыбак. **Яны** жывуць у нас ужо даўно.

***дэлега́цыя***

Якія выдзеленыя словы ўказваюць на асобу чалавека? Якое выдзеленае слова ўказвае на прадмет? Якое выдзеленае слова ўказвае на жывёл?

Словы ***я, мы, ты, вы, ён, яна, яно, яны*** не называюць асобу або прадмет, а толькі ўказваюць на іх. Гэта **займеннікі**.

**73.** Назавіце займеннік, які «схаваўся» ў слоўнікавым слове. Прыдумайце і запішыце сказ з гэтым займеннікам і словам *дэлегацыя*. Падкрэсліце дзейнік і выказнік у запісаным сказе.

**Завяжы вузялок!**

Займеннік — гэта часціна мовы. У сказе ён часта бывае дзейнікам.



Правообладатель Национальный институт образования

**74.** Прачытайце. Які настрой перадаецца ў вершы?

Я ў радок пастаўлю слоўкі —
**вы,**
**мы,**
**ты,**
**я.**
Дождж і сонейка. Галоўкі
**вымытыя.**

Многа нас! Нібы салоўкі —
**вы,**
**мы,**
**ты,**
**я.**
Барсучок бяжыць нялоўкі —
**выліты я!**

*Д. Бічэль.*

Якія з выдзеленых слоў з'яўляюцца займеннікамі? Назавіце займеннікі, якія «схаваліся» ў астатніх выдзеленых словах.

Спішыце першы слупок верша. Падкрэсліце займеннікі.

**75.** Прачытайце тэкст. Якая ў ім ёсць недакладнасць? Якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы? Чым можна замяніць іх, каб пазбегнуць паўтораў?

### Бярозка

У шчылінку паміж дошкамі мосціка прабілася бярозка. **Бярозка** цягнулася да сонца і шапацела зялёнымі лісцікамі. Людзі шкадавалі бярозку. **Людзі** стараліся не зачапіць дрэўца.



Правообладатель Национальный институт образования

Кожны раз Міколка падыходзіў да мосціка з хваляваннем. Аднойчы **Міколка** выкапаў дрэўца і пасадзіў каля дарогі. Цяпер **дрэўца** ўжо вялікае. *(Паводле М. Янчанкі.)*

Прачытайце выпраўлены тэкст. Колькі ў ім частак? Запішыце адну частку тэксту на выбар. Падкрэсліце займеннікі, якімі вы замянілі выдзеленыя словы.

Назавіце сказ з аднароднымі членамі. Падкрэсліце ў ім дзейнік і выказнік.

**Завяжы вузялок!**

Займеннікі могуць ужывацца для сувязі сказаў у тэксце. Яны дапамагаюць пазбегнуць паўтарэння адных і тых жа слоў.

**76.** Замест якога назоўніка ў кожнай групе прыказак ужыты выдзеленыя займеннікі? Са слоў для даведкі падбярыце патрэбныя назоўнікі. Назавіце прыказкі. Чаму так гавораць?

1. **Яна** даражэйшая за грошы. **Яна** не патоне і не згарыць.
2. **Яно** як птушка: выпусціў — не вернеш. **Яно** — вецер, а папера — грунт.
3. Не адзенне красіць **яго**, а **ён** адзенне. **Ён** без сябра — што дрэва без кораня.

Словы для даведкі: *чалавек, вецер, праўда, песня, прывітанне, слова.*

Запішыце адну з прыказак на выбар.



Правообладатель Национальный институт образования

**77.** Дапоўніце тэкст патрэбнымі займеннікамі. Запішыце.

Аня ідзе ў школу. ... з цікавасцю глядзіць навокал. Сонейка саграває зямлю. ... лашчыць твар дзяўчынкі. Недалёка ад школы Аня сустракае Алёшу. ... радасна вітаецца з аднакласніцай. Дзеці разам ідуць далей. ... з захапленнем абмяркоўваюць учарашнюю экскурсію.

Падкрэсліце дзейнік і выказнік у апошнім сказе. Пазначце, якой часцінай мовы з’яўляецца кожнае слова ў ім.

## Займеннікі 1, 2, 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку

**78.** Прачытайце тэкст. Назавіце тых асоб, на якіх указваюць выдзеленыя займеннікі.

### Пазнаёміліся

Першымі ў клас прыйшлі Алесь, Дзяніс і Вераніка. Вучні пачалі рыхтавацца да першага ўрока. **Яны** дасталі з рукзакоў падручнікі, сшыткі, пеналы.




Правообладатель Национальный институт образования

Чацвёртакласнікі здзівіліся, калі ў клас увайшла незнаёмая дзяўчынка.

— **Ты** хто? — спытаў Алесь.

— **Я** — Каця, — адказала незнаёмка. — **Я** буду вучыцца ў гэтым класе. А **вы** хто?

— **Я** — Алесь, **ён** — Дзяніс, а **яна** — Вераніка. **Мы** вучні гэтага класа і даўнія сябры. Ты будзеш сябраваць з намі?

— З вялікім задавальненнем, — пагадзілася Каця.

?! Які займеннік выкарыстоўвае Алесь, калі гаворыць пра сябе? Пра сябе і сяброў? Пра Дзяніса? Пра Вераніку? Які займеннік выкарыстоўвае Алесь, калі звяртаецца да Каці? Які займеннік выкарыстоўвае Каця, калі звяртаецца да вучняў класа?

### Завяжы вузялок!

***Я, мы, ты, вы, ён, яна, яно, яны*** — гэта **асабовыя займеннікі.** Яны ўказваюць на асобу або прадмет, пра якія ідзе размова:

1-я асоба ***(я, мы)*** — на таго (тых), хто гаворыць;

2-я асоба ***(ты, вы)*** — на таго (тых), да каго звяртаюцца ў размове;

3-я асоба ***(ён, яна, яно, яны)*** — на таго (тых), хто не ўдзельнічае ў размове.

**79.** Дапоўніце сказы патрэбнымі асабовымі займеннікамі.

... люблю вучыцца. Хутка ... скончыш чацвёрты клас.

На канікулах ... выправімся ў падарожжа.



Правообладатель Национальный институт образования

Кірыл марыць стаць авіяканструктарам. … зрабіў прыгожую мадэль самалёта.

Узышло сонейка. … асвяціла промнямі наваколле.

Вецер наляцеў на бярозку. … закалыхала галінкамі.

Заўтра … паедзеце на экскурсію.

Праз тыдзень … паедуць у Белавежскую пушчу.

Спачатку спішыце сказы, у якіх асабовы займеннік указвае на адну асобу або прадмет. Потым запішыце сказы, у якіх займеннік указвае на некалькі асоб.

***чацвёрты***

**Завяжы вузялок!**

Асабовыя займеннікі ***я, ты, ён, яна, яно*** ўказваюць на адну асобу. Гэта займеннікі адзіночнага ліку.

Асабовыя займеннікі ***мы, вы, яны*** ўказваюць на некалькі асоб. Гэта займеннікі множнага ліку.

**80.** Вусна дапоўніце сказы асабовымі займеннікамі.

1. Мама лечыць жывёл. … працуе ветэрынарам. 2. Тата стварае праекты будынкаў. … працуе архітэктарам. 3. Дзіця гойдаецца на арэлях. … радасна смяецца.

Выпішыце займеннікі разам з назоўнікамі, якія яны замяняюць у сказах. Вызначце асобу і лік займеннікаў. Вызначце род назоўнікаў.

**Завяжы вузялок!**

Займеннікі 3-й асобы ў адзіночным ліку маюць формы ўсіх трох родаў: ***ён*** — мужчынскі род, ***яна*** — жаночы род, ***яно*** — ніякі род.



Правообладатель Национальный институт образования

**81.** Прачытайце загадкі. З «рассыпаных» літар складзіце адгадкі-антонімы. Запішыце іх.




1. Яна — маўклівая, нямая,
безабаронная такая.
Калі патрэбна адпачыць,
яна павінна побач быць.

2. А ён як з'явіцца, цягучы,
нястрымны, гулкі ці пявучы,
то, безгалосая, якраз
яна пакіне ўмомант нас.

*М. Пазнякоў.*




Знайдзіце займеннікі 3-й асобы, вызначце іх лік, род.

**82.** Дапоўніце жарт асабовымі займеннікамі. Вызначце іх асобу і лік.

— Толя, Жэня, чаму ... размаўляеце на ўроку? – спытала настаўніца. — Хіба вам не хапае перапынку?

— На перапынках нам няма калі размаўляць, — адказаў Толя. — ... тады мяч ганяем! *(М. Кавалёў.)*

**83.** Дапоўніце сказы патрэбнымі займеннікамі. Запішыце.

1. ... хачу паглядзець новы фільм. ... з сябрам сходзім у кінатэатр. 2. Як ... павіншуеце матуль? ... будзеш спяваць на святочным канцэрце? 3. Бабуля пячэ пірагі з яблыкамі. ... чакае ў госці ўнукаў. ... хутка прыедуць.

Вызначце асобу, лік, род займеннікаў.



Правообладатель Национальный институт образования

## Скланенне займеннікаў 1-й асобы

**84.** Дапоўніце кожны сказ займеннікам 1-й асобы.

... хачу стаць авіяканструктарам. ... падабаецца збіраць мадэлі самалётаў.

**?!** У сказах былі выкарыстаны розныя займеннікі ці розныя формы аднаго займенніка?

**85.** Разгледзьце табліцу скланення займеннікаў 1-й асобы. Чым адрозніваецца форма назоўнага склону займеннікаў ***я, мы*** ад іншых форм?

| Склоны | Пытанні | Займеннікі 1-й асобы | |
|---|---|---|---|
| | | **адз. л.** | **мн. л.** |
| **Н.** | к т о? | *я* | *мы* |
| **Р.** | к а г о? | *мяне* | *нас* |
| **Д.** | к а м у? | *мне* | *нам* |
| **В.** | к а г о? | *мяне* | *нас* |
| **Т.** | к і м? | *мной(-ою)* | *намі* |
| **М.** | (пры) к і м? | *(пры) мне* | *(пры) нас* |

У якіх склонах займеннік ***я*** мае аднолькавыя формы? У якім склоне займеннік ***я*** мае варыянты канчаткаў?

У якіх склонах займеннік ***мы*** мае аднолькавыя формы?

Форма якога склону ўжываецца толькі з прыназоўнікамі? Як пішуцца прыназоўнікі з займеннікамі?

**Завяжы вузялок!**

Асабовыя займеннікі змяняюцца **па склонах.**



Правообладатель Национальный институт образования

**Прыназоўнікі** з займеннікамі **пішуцца асобна.**

**86.** Прачытайце і запішыце сказы. Вусна пастаўце пытанні ад выдзеленых слоў да асабовага займенніка. Вызначце склон займенніка ***я*** ў сказах.

1. Я **займаюся** ў спартыўнай секцыі па плаванні. 2. Мне вельмі **падабаюцца** спартыўныя спаборніцтвы. 3. Там мяне заўсёды **падтрымліваюць** тата, мама, малодшы брат. 4. Бацькі **ганарацца** мной. 5. Пры мне трэнер **запрашаў** брата ў секцыю па плаванні.

Якой формы займенніка ***я*** няма ў сказах?



Якіх вядомых беларускіх плыўцоў вы ведаеце? Пра якія спартыўныя дасягненні іх можаце расказаць? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў бацькоў або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

***услы́х***

**87.** Дапоўніце спалучэнні слоў займеннікам ***мы*** ў патрэбным склоне і запішыце.

Слухалі (к а г о?) ..., дзякаваў (к а м у?) ..., зайшла (д а к а г о?) да ..., сябруе (з к і м?) з ..., гаварылі (п р ы к і м?) пры ... .

Вызначце склон займенніка ***мы*** ў кожным спалучэнні.

Назавіце слова, аднакаранёвае да слоўнікавага. Запішыце пару аднакаранёвых слоў, выдзеліце ў іх корань. Назавіце гукі, якія змяніліся ў каранях слоў.


Правообладатель Национальный институт образования

**88.** Вызначце склон выдзеленых у сказах займеннікаў.

1. Сябры сустрэлі **мяне** на аўтобусным прыпынку. Дзядуля падрыхтаваў для **мяне** падарунак. **Мяне** парадавала адзнака за кантрольную работу. Браты хадзілі ў кінатэатр без **мяне**.

2. Бацькі падрыхтавалі для **нас** святочныя падарункі. Бабуля даўно чакала **нас** у госці. Да **нас** у госці прыйшоў пісьменнік. **Нас** усхвалявала гэта навіна.

?! Карыстаючыся падказкай, растлумачце, як адрозніць форму роднага і вінавальнага склонаў асабовых займеннікаў.

Падказка: *сустрэлі* (каго?) ***мяне*** — *сустрэлі* (каго?)
В. В.
***маму*** — ***мяне***.

*Падрыхтаваў* (для каго?) *для* ***мяне*** — (для каго?)
Р. Р.
*для* ***мамы*** — *для* ***мяне***.

**89.** Спішыце загадку, дапаўняючы яе патрэбнымі формамі займенніка ***я***. Запішыце слова-адгадку.



Калі на небе сонца ззяе,
я ў даганялкі з ім гуляю.
Мы бегаем — аж пыл сцяной:
(за кім?)
то я за ім, то ён за ... .
Ды не дагнаў ні разу, не —
(каго?)
ні я яго, ні ён ... .

*І. Муравейка.*

Падкрэсліце ў загадцы займеннікі 1-й асобы і іх формы.


Правообладатель Национальный институт образования

## Скланенне займеннікаў 2-й асобы

**90.** Дапоўніце кожны сказ займеннікам 2-й асобы і запішыце.

Зараз ... зробіш дамашняе заданне. Потым тата паедзе з ... у басейн.

Вызначце сувязь слоў у кожным сказе.

**?!** У сказах былі выкарыстаны розныя займеннікі ці розныя формы аднаго займенніка?

**91.** Разгледзьце табліцу скланення займеннікаў 2-й асобы.

| Склоны | Пытанні | Займеннікі 2-й асобы | |
|---|---|---|---|
| | | адз. л. | мн. л. |
| **Н.** | хто? | *ты* | *вы* |
| **Р.** | каго? | *цябе* | *вас* |
| **Д.** | каму? | *табе* | *вам* |
| **В.** | каго? | *цябе* | *вас* |
| **Т.** | кім? | *табой(-ою)* | *вамі* |
| **М.** | (пры) кім? | *(пры) табе* | *(пры) вас* |

У якіх склонах займеннік ***ты*** мае аднолькавыя формы? У якім склоне займеннік ***ты*** мае варыянты канчаткаў?

У якіх склонах займеннік ***вы*** мае аднолькавыя формы?

Форма якога склону ўжываецца толькі з прыназоўнікамі?

**Завяжы вузялок!**

Асабовы займеннік у сказе бывае не толькі дзейнікам, але і даданым членам сказа.



Правообладатель Национальный институт образования

**92.** Прачытайце верш вучаніцы Алесі Жэбрак пра родны горад. Што вы ведаеце пра Ваўкавыск?



## Ваўкавыск

Мой лю́бы горад Ваўкавыск,
табой я **ганаруся,**
хаджу па вуліцах адна
і на цябе **дзіўлюся.**

Мой любы горад Ваўкавыск,
табе дабра **жадаю**
і песні, вершы пра цябе
**спяваю** і **складаю.**

Вусна пастаўце пытанні ад выдзеленых слоў да асабовага займенніка. Вызначце склон займенніка ***ты*** ў сказах.

**Рм** Што вы можаце расказаць пра свой родны горад (пасёлак, вёску)? Якія словы падыходзяць для яго (яе) апісання?

**93.** Прачытайце. Вызначце склон займенніка ***вы*** ў пытальных сказах. Вусна адкажыце на пытанні.

Чым вы займаецеся ў вольны час? Якія кнігі цікавяць вас? Ці купляюць вам бацькі часопіс «Вясёлка»? Ці дасылалі вы туды свае творы, малюнкі? Якія матэрыялы часопіса з’яўляюцца карыснымі для вас? Ці праводзілі з вамі сустрэчу члены рэдакцыі часопіса або газеты?

Запішыце тры сказы-адказы на выбар. Знайдзіце асабовыя займеннікі ў сказах-адказах і вызначце іх асобу, лік. У займенніках 1-й і 2-й асобы вызначце склон.


Правообладатель Национальный институт образования

**Завяжы вузялок!**

Пры ветлівым пісьмовым звароце (пісьмо, запрашэнне) да незнаёмага або старэйшага па ўзросце чалавека трэба ўжываць займеннік ***Вы*** і яго склонавыя формы ***Вас, Вам, Вамі***. Яны пішуцца з вялікай літары.

**94.** Прачытайце запрашэнне на выпускны ранішнік, якое падрыхтавалі вучні для сваёй настаўніцы замежнай мовы.

Паважаная Марыя Васільеўна!

Запрашаем *(В/в)*ас на наш выпускны ранішнік. Свята адбудзецца 31 мая а дванаццатай гадзіне. Чакаем *(В/в)*ас у актавай зале. Будзем вельмі рады *(В/в)*ам.

Вучні 4-га «А» класа.

Які асабовы займеннік ужываецца ў запрашэнні? Якую літару трэба ўставіць у словы? Чаму?

Вызначце склон асабовага займенніка ў сказах.

Напішыце запрашэнне настаўніку музыкі (фізічнай культуры, замежнай мовы) на ваш выпускны ранішнік.

**Гаварыце правільна!**

а пятай гадзіне, у пяць гадзін

**95.** Дапоўніце спалучэнні слоў патрэбнымі формамі займенніка ***ты***.

Бачылі (к а г о?) ..., прапанавала (к а м у?) ..., забеглі (д а к а г о?) да ..., гуляе (з к і м?) з ..., гаварылі (п р ы к і м?) пры ... .

Вызначце склон займенніка ў кожным спалучэнні.



Правообладатель Национальный институт образования

**96.** Спішыце сказы, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

1. Алена Пятроўна, **віншуем** *(В/в)*ас са святам! 2. Ці **даводзілася** *(В/в)*ам, дзеці, удзельнічаць у алімпіядзе па беларускай мове? 3. Дачушкі, сёння дзядуля **пойдзе** з *(В/в)*амі ў музей. 4. Алег Пятровіч, шчыра **жадаем** *(В/в)*ам поспехаў у рабоце! 5. Ганна Васільеўна, **запрашаем** *(В/в)*ас на святочны канцэрт.

Вусна пастаўце пытанні ад выдзеленых слоў да асабовага займенніка. Вызначце асобу, лік і склон асабовага займенніка ў сказах.

## Скланенне займеннікаў 3-й асобы

**97.** Разгледзьце табліцу скланення займеннікаў 3-й асобы.

<table>
<tr><th rowspan="3">Склоны</th><th rowspan="3">Пытанні</th><th colspan="4">Займеннікі 3-й асобы</th></tr>
<tr><th colspan="3">адз. л.</th><th rowspan="2">мн. л.</th></tr>
<tr><th>ж. р.</th><th>н. р.</th><th>м. р.</th></tr>
<tr><td>Н.</td><td>хто?</td><td>яна</td><td>яно</td><td>ён</td><td>яны</td></tr>
<tr><td>Р.</td><td>каго?</td><td>яе</td><td colspan="2">яго</td><td>іх</td></tr>
<tr><td>Д.</td><td>каму?</td><td>ёй</td><td colspan="2">яму</td><td>ім</td></tr>
<tr><td>В.</td><td>каго?</td><td>яе</td><td colspan="2">яго</td><td>іх</td></tr>
<tr><td>Т.</td><td>кім?</td><td>ёй(ёю)</td><td colspan="2">ім</td><td>імі</td></tr>
<tr><td>М.</td><td>(пры) кім?</td><td>(пры) ёй</td><td colspan="2">(пры) ім</td><td>(пры) іх</td></tr>
</table>

Як скланяюцца займеннікі ***ён*** і ***яно***? У якіх склонах гэтыя займеннікі маюць аднолькавыя формы?


Правообладатель Национальный институт образования

У якіх склонах займеннік ***яна*** мае аднолькавыя формы? У якім склоне гэты займеннік мае два варыянты?

У якіх склонах займеннік ***яны*** мае аднолькавыя формы?

Форма якога склону ўжываецца толькі з прыназоўнікамі? Як пішуцца прыназоўнікі з займеннікамі?

**98.** Дапоўніце загадку патрэбнай формай займенніка ***яна***. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.

х т о?

... зроду не падводзіць

з к і м?

тых, хто з ... у дружбе ходзіць.
Павыводзіць тых у людзі,

к а г о?

хто ... з маленства любіць.

*У. Паўлаў.*




Вызначце склон займенніка ***яна*** ў загадцы.

**99.** Спішыце спалучэнні слоў, раскрываючы дужкі.

Спяваў (з к і м?) з *(яна)*, сустракалі (к а г о?) *(яны)*, падарыў (к а м у?) *(ён)*, убачыла (к а г о?) *(яно)*, пайшла (б е з к а г о?) без *(ён)*, ганарымся (к і м?) *(яно)*, гаварылі (п р ы к і м?) пры *(яны)*.

Вызначце род, лік склон займенніка ў кожным спалучэнні.

З адным спалучэннем слоў на выбар складзіце і запішыце сказ. Падкрэсліце ў ім дзейнік і выказнік.


Правообладатель Национальный институт образования

**100.** У кожным радку слоў знайдзіце лішняе. Растлумачце свой выбар.

1. Яна, яе, ёй, ёю, яно.
2. Яго, яна, яму, ён, ім.
3. Іх, вы, ім, яны, імі.

**101.** Дапоўніце сказы патрэбнымі формамі займеннікаў. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

1. Каля рэчкі бы**ў** в**я**лікі луг. На ... пасвіліся козы. ... былі белыя з шэрымі плямамі. 2. У зубах вавёрка трымала жолуд. ... схавала ... **ў** дупло, паскакала далей. 3. Кацяня грэлася на сонейку. Таня пр**ы**несла ... малака **ў** сподачку.

Выпішыце сказы з займеннікамі. Вызначце асобу, лік, склон займеннікаў.

**102.** Якія літары трэба ўставіць замест пытальнікаў, каб атрымаць асабовыя займеннікі ў розных склонах?






Правообладатель Национальный институт образования

**103.** Прачытайце тэкст. Дапоўніце яго патрэбнымі асабовымі займеннікамі. Што выклікала ў вас усмешку? Чаму тэкст мае такую назву?

## Малы ды клапатлівы

Калі сціх дождж і зноў заззяла сонейка, Вова пачаў прасіцца, каб мама пусціла ... на двор.

— Ідзі, толькі не лезь у ваду і не намачыся, а то прастудзішся, — сказала мама.

Ля ганка Вова ўбачыў вялікую лужыну. ... знайшоў палку і стаў завіхацца ля вады. Неўзабаве з хаты выйшла маці.

— Вова, што ... робіш?

— Ваду спускаю.

— Навошта?

— Каб ... не намачыла ногі і не прастудзілася, — адказаў хлопчык. *(П. Рунец.)*



***завіха́цца*** — старанна штосьці рабіць
***неўза́баве*** — хутка, у хуткім часе

Вызначце асобу, лік і склон асабовых займеннікаў.



Правообладатель Национальный институт образования

**104.** Спішыце тэкст, ужываючы асабовы займеннік у патрэбнай форме.

## Совы

У старым вясковым парку расло шмат дуплаватых дрэў. *(Яны)* аблюбавала вялікая савіная сям'я. Хораша жылося птушкам. Хапа́ла *(яны)* корму ў садах і на падворках. Людзі не крыўдзілі птушак. *(Яны)* радаваліся знікненню шкоднікаў на агародах у садах. *(Паводле М. Пазнякова.)*



Пастаўце, дзе трэба, коскі паміж аднароднымі членамі сказа.

### Адкажыце на пытанні

1. На што ўказваюць асабовыя займеннікі? Назавіце займеннікі 1, 2, 3-й асобы.
2. Якога ліку бываюць асабовыя займеннікі? Назавіце спачатку асабовыя займеннікі адзіночнага ліку, потым — множнага.



Правообладатель Национальный институт образования

3. Займеннікі якой асобы маюць род? Назавіце займеннік мужчынскага, ніякага і жаночага роду.
4. Як змяняюцца асабовыя займеннікі?
5. Як пішуцца прыназоўнікі з займеннікамі?
6. Які займеннік выкарыстоўваецца пры ветлівым пісьмовым звароце да незнаёмага або старэйшага па ўзросце чалавека? З якой літары ён пішацца ў гэтым выпадку?

*Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? Да якіх тэм трэба звярнуцца яшчэ раз, каб правільна адказаць на гэтыя пытанні?*



Уявіце, што ў класе праводзіцца канферэнцыя на тэму «Асабовыя займеннікі ў беларускай мове». Вам прапанавалі выступіць на гэтай канферэнцыі з дакладам. Падрыхтуйце паведамленне з прыкладамі на адну з наступных тэм: «Займеннікі 1, 2, 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку», «Скланенне займеннікаў 1-й асобы», «Скланенне займеннікаў 2-й асобы», «Скланенне займеннікаў 3-й асобы». Карыстайцеся інфармацыяй, змешчанай на форзацы.

Правообладатель Национальный институт образования

# ДЗЕЯСЛОЎ

**Успомніце**

Што вы ведаеце пра дзеяслоў?
Выкарыстайце схему.

**Дзеяслоў**

што робіць? што робяць? што рабіў?
што рабіла? што будзе рабіць?

Хлопчык **плыў.**
Хлопчык **плыве.**
Хлопчык **будзе плыць.**

Хлопчык **плыве.**
Хлопчыкі **плывуць.**

Хлопчык **плыў.**
Дзяўчынка **плыла́.**
Воблака **плыло.**

## Змяненне дзеясловаў па часах і ліках

**105.** Прачытайце тэкст. Пра якія падзеі (якія адбываліся, адбываюцца ці будуць адбывацца) ідзе размова?

Вавёрка збірае арэхі, рыхтуе запасы на зіму. Звярок хавае іх у дупле старога дрэва. Вавёрка робіць кладоўкі і пад каранямі дрэў. У такіх кладоўках яна трымае толькі добрыя арэхі. *(Паводле В. Вольскага.)*


Правообладатель Национальный институт образования

Назавіце ў тэксце дзеясловы, вызначце іх час, лік.

Змяніце тэкст так, каб у ім ішла размова пра падзеі, якія ўжо адбываліся або якія яшчэ будуць адбывацца. Запішыце тэкст, які атрымаўся. Вызначце час і лік дзеясловаў.

Знайдзіце ў тэксце сказ з аднароднымі членамі. Падкрэсліце ў ім дзейнік і выказнік. Якую ролю ў сказе выконваюць аднародныя члены?

**106.** Прачытайце дзеясловы з правага слупка. Пастаўце да іх пытанні. Вызначце іх час, лік. Дапоўніце верш гэтымі дзеясловамі, змяніўшы іх па пытаннях. Што змянілася ў дзеясловах?

### Карусель

Ветрык з хмаркамі (што робіць?) ...,  
з імі ў хованкі (што робіць?) ...:  
у нябёсах (што робіць?) ... —  
вышыні ён не баіцца.  
Хмарка (што робіць?) ... хмарку —  
карусель (што робіць?) ... над паркам.

*Т. Сучкова.*

*лятаюць*  
*гуляюць*  
*весяляцца*  
*даганяюць*  
*плывуць*

Запішыце верш. Вызначце лік дзеясловаў.

Знайдзіце ў вершы асабовыя займеннікі. Вызначце іх род, лік і склон.

**Гаварыце правільна!**

адзеў (каго?) сына, адзела (каму?) сыну *(шапку)*;  
надзеў (на каго?) на сябе,  
*(сын)* надзеў (што?) шапку, надзеў (што?) акуляры



Правообладатель Национальный институт образования

**107.** Да кожнага выдзеленага назоўніка падбярыце дзеясловы ў дужках.

1. **Мама** *(адзявае, надзявае)* дачушку. 2. **Машына** *(буксуе, буксіруе)* на месцы. 3. **Сяргейка** *(адзене, надзене)* паліто. 4. **Маляры** *(пабялелі, пабялілі)* сцены. 5. **Каваль** яшчэ не *(акаваў, падкаваў)* каня. 6. Хутка *(выгляне, выглядзіць)* **сонейка.**

Запішыце сказы, якія ў вас атрымаліся. Вызначце час і лік дзеясловаў.

**108.** Што абазначае выраз у левым слупку? Выберыце яго значэнне з правага слупка.

| | |
|---|---|
| Узяць за душу́ | *моцна ўсхваляваць*<br>*моцна абняць* |

Прачытайце. Вызначце час і лік дзеясловаў у сказах.

У бабулі на вачах з'явіліся слёзы пасля цёплых слоў унука. Яе **моцна ўсхвалявала** віншаванне хлопчыка.

Які выраз можна выкарыстаць замест выдзеленага? Прачытайце апошні сказ, замяніўшы выдзелены выраз блізкім па значэнні.

**109.** Прачытайце загадкі. З «рассыпаных» літар складзіце словы-адгадкі.




1. Ён у агні не гарыць у вадзе не тоне і па саломе не шапаціць.


Правообладатель Национальный институт образования

2. Цераз палі цераз лугі спусціліся канцы дугі.

с н а а с

к я а в с ё л

3. Я засцілаю дол іглiцай спрадвеку слаўлюся жывіцай.

***жывíца*** — *празрыстая смала, якая выцякае са ствалоў хвойных дрэў*
***спрадвéку*** — *здаўна*

Спішыце. Пастаўце, калі трэба, коску паміж аднароднымі членамі.

Вызначце час дзеясловаў у сказах.

## Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах. Суфіксы дзеясловаў прошлага часу

### Успомніце

У форме якога ліку дзеясловы прошлага часу змяняюцца па родах? Якія суфіксы маюць дзеясловы прошлага часу?

Выкарыстайце схему.

**Дзеясловы прошлага часу**

| | | |
|---|---|---|
| Дрэва **расло, зелянела.**<br>Клён **рос, зелянеў.**<br>Бяроза **расла, зелянела.** | → | Дрэвы<br>Клёны → **раслі, зелянелі.**<br>Бярозы |



Правообладатель Национальный институт образования

**110.** Утварыце сказы па ўзоры і запішыце іх. Вызначце лік і род дзеясловаў прошлага часу. Выдзеліце ў іх суфіксы, канчаткі.

У з о р: *Зашумеў*□ (адз. л., м. р.) *асенні лес*.

**Зашуме..** асенні лес.
сіняе мора.
хуткая рака.
марскія хвалі.

**Паплы..** па зорным небе месяц.
па рацэ рыбацкая лодка.
па небе лёгкае воблака.
у паветры павуцінкі бабінага лета.

**?!** Якія канчаткі могуць мець дзеясловы прошлага часу ніякага роду? Ад чаго залежыць выбар канчатка ў іх?

**111.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.




**112.** Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся хутка і правільна іх вымаўляць.

1. Прыляцеў да сябра верабей.
   Сябра ў верабейкі — салавей.


Правообладатель Национальный институт образования

2. Забялела грэчка ў полі,
загулі над грэчкай пчолы.
*М. Пазнякоў.*

У якім часе ўжыты дзеясловы ў скорагаворках? Вызначце лік і род дзеясловаў. Назавіце іх суфіксы, канчаткі.

**113.** Дапоўніце сказы патрэбнымі дзеясловамі прошлага часу. Вызначце лік і род дзеясловаў.

1. Хлопчык ... з дрэва чырвоны яблык. 2. Матуля ... дзяцей абедаць. 3. Дзіця добра ... усю ноч. 4. Па возеры ... прыгожыя лебедзі. 5. Дзяўчынка ... сяброўцы цікавую кніжку. 6. Вучні правільна ... усе задачы.

Запішыце тры сказы на выбар. У дзеясловах прошлага часу выдзеліце суфіксы.

**114.** Прачытайце. Вусна замяніце кожнае спалучэнне слоў асобным дзеясловам.

*Знайшл*о (адз. л., н. р.) *адгадку — адгадал*а *(...)*
даў параду —
зрабіў запіс —
дала́ заданне —

Вызначце лік і род дзеясловаў прошлага часу. Назавіце суфіксы і канчаткі гэтых дзеясловаў.

Якога роду можа быць дзеяслоў *рашыла*? Складзіце адзін сказ з дзеясловам *рашыла* ў форме жаночага роду, другі — з дзеясловам *рашыла* ў форме ніякага роду.

**Гаварыце правільна!**

дала́, задала́, прыняла́, бра́ла, рва́ла



Правообладатель Национальный институт образования

**115.** Прачытайце тэкст. Дапоўніце дзеясловы прошлага часу патрэбнымі суфіксамі і канчаткамі.

### Птушаня

Настачка бе́г.. ў краму. Каля парку яна заўважы.. дзіўны камячок. Гэта была птушка. Дзяўчынка забы.. пра краму. Яна ўзя.. птушку ў рукі і пабе́г.. дамоў.



Тата пазна.. птушаня шэрай савы. Ён узяў кавалачак мяса парэзаў яго і пакармі.. птушачку. Потым дачушка кармі.. птушаня мяня.. яму ваду чысці.. клетку.

Улетку мама тата і Настачка паеха.. у вёску да бабулі. Там яны выпусці.. птушку ў лес. *(Паводле А. Вашчанкі.)*

Выпішыце з тэксту сказы з аднароднымі членамі. Пастаўце ў іх патрэбныя знакі прыпынку. Абазначце суфіксы і канчаткі ў дзеясловах прошлага часу. Вызначце іх лік і род.

## Неазначальная форма дзеяслова

**116.** Прачытайце. У якіх сказах дзеясловы ўжыты ў форме адзіночнага ліку? Вызначце час гэтых дзеясловаў.

1. Хлопчык бяжыць па парку. Прыемна бег**чы** па парку сонечным днём.

2. У панядзелак Света ўстае рана. У нядзелю можна рана не ўстава**ць**.



Правообладатель Национальный институт образования

3. Перад урокам Віця пакладзе на парту альбом і фарбы. Пасля ўрокаў трэба паклас**ці** свае рэчы ў рукзак.

Запішыце астатнія сказы. Знайдзіце ў іх дзеясловы. На якія пытанні яны адказваюць?

Дзеясловы, якія адказваюць на пытанні ш т о р а б і ц ь? ш т о з р а б і ц ь?, — гэта дзеясловы ў **неазначальнай форме**. Яны заканчваюцца на -***ць***, -***ці***, -***чы***.

**Завяжы вузялок!**

У дзеясловаў у неазначальнай форме нельга вызначыць час, лік.

**117.** Прачытайце верш. Хто з вас марыць стаць касманаўтам? Як трэба рыхтавацца да палёту ў космас? Што трэба выхоўваць у сабе?



**Быць касманаўтам...**

Каб, сябры, у космас паляцець,
трэба многа ведаць і ўмець.
Быць Радзіме і сябра́м адданым,
смелым, шчырым і загартаваным.

*Н. Галіноўская.*

Спішыце. Знайдзіце і падкрэсліце дзеясловы ў неазначальнай форме.

У дзеяслове, які адказвае на пытанне ш т о з р а б і ц ь?, выдзеліце корань і прыстаўку.



Калі адзначаецца Дзень касманаўтыкі? Чаму? Назавіце прозвішчы касманаўтаў, якія нарадзіліся ў Беларусі.



Правообладатель Национальный институт образования

Што вы ведаеце пра іх? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў старэйшых або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**118.** Прачытайце прыказку. У якіх сітуацыях так гавораць?

Як **вучы́ць** — дык **ву́чыць**, а як зрабіць — дык не зробіць.

Спішыце. Вусна пастаўце пытанні да дзеясловаў у прыказцы. Падкрэсліце дзвюма рыскамі дзеясловы ў неазначальнай форме.

Чым адрозніваецца вымаўленне выдзеленых дзеясловаў?

**119.** Змяніце дзеясловы па ўзоры.

Узор: *зрабі́ць — зробіць*

схадзі́ць — ...
змяні́ць — ...
палячы́ць — ...

Вусна пастаўце пытанні да дзеясловаў кожнага слупка. Падкрэсліце дзеясловы ў неазначальнай форме.

З адным дзеясловам у неазначальнай форме вусна складзіце сказ.

**120.** Прачытайце дзеясловы. Вызначце іх лік, час. Вымавіце гэтыя ж словы з націскам на другім складзе. На якія пытанні сталі адказваць словы?

Зва́рыць, су́шыць, спа́ліць.

Дапоўніце сказы патрэбнымі дзеясловамі ў неазначальнай форме.


Правообладатель Национальный институт образования

1. Мама абяцала … смачны суп. 2. Бабуля пачала … баравікі. 3. Тата хоча … сухое веццe.

Запішыце два сказы на выбар. Абазначце націск у дзеясловах, ужытых у неазначальнай форме.

**121.** Спішыце прыказкі, раскрываючы дужкі.

1. Трэба рана ўстаць, каб хлеба *(пры)*чакаць. 2. З рамяством дружы́ць — *(у)*жыцці *(не)*тужы́ць. 3. Цяжка таму жыць, хто *(ад)*працы бяжыць. 4. Лепей трошкі зрабіць, чым багата *(на)*гаварыць. 5. Лёгка грошы *(ад)*даць, а ці лёгка *(за)*рабіць?

Падкрэсліце дзеясловы ў неазначальнай форме.

## Правапіс дзеясловаў на *-ся, -цца*

**122.** Утварыце дзеясловы па ўзоры. На якія пытанні яны адказваюць?

1. Мы<u>ць</u> — мы<u>цца</u>, абуваць — …, выціраць — … .
2. Стрыгчы — стрыгчы<u>ся</u>, берагчы —…, сцерагчы — … .

Запішыце пары слоў. Падкрэсліце часткі, якімі адрозніваюцца дзеясловы.

Дапоўніце сказы патрэбнымі дзеясловамі з першай групы.

1. Андрэй скончыў … посуд. Мікіта любіць … у ванне. 2. Матуля пачала … чаравікі. Маленькая Ірынка хоча … сама. 3. Наташа збіраецца … пыл з мэблі. Пасля купання трэба … на́суха.



Правообладатель Национальный институт образования

**123.** Прачытайце спалучэнні слоў у левым слупку. Знайдзіце іх значэнне ў правым слупку.

| | |
|---|---|
| красці**ся** на цыпачках | *ісці вельмі марудна* |
| плесці**ся** нага за нагу | *ісці на пальцах ног* |
| несці**ся** на злом галавы | *бегчы вельмі хутка, імкліва* |

Запішыце вобразныя выразы і знайдзіце ў іх дзеясловы. У якой форме ўжыты дзеясловы? Якім спалучэннем літар яны заканчваюцца?

**Завяжы вузялок!**

Да дзеяслова можа далучацца частка ***-ся (-ца, -цца)***: *трэсціся, прыбірацца, прыбіраецца*.

**Будзьце ўважлівыя!**

| У беларускай мове | У рускай мове |
|---|---|
| *мы**цца*** | *мы**ться*** |
| *весялі**цца*** | *весели**ться*** |
| *каці́**цца*** | *кати́**ться*** |
| *пле́сці**ся*** | *плести**сь*** |
| *не́сці**ся*** | *нести**сь*** |

**124.** Пастаўце пытанне да дзеяслова. У якой форме ён ужыты?

**Засмяяцца** | … суседскі хлопчык.
… летняе сонейка.
… старэнькая бабулька.
… маленькія дзеці.



Правообладатель Национальный институт образования

Дапоўніце сказы прапанаваным дзеясловам у форме прошлага часу. Запішыце іх. Падкрэсліце частку, якой заканчваецца дзеяслоў у сказах.

У з о р: *Засмяяўся суседскі хлопчык.*

**125.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

1. Умеў памылі*(ц/цц)*а, умей і паправі*(ц/цц)*а. 2. Лёгка пасвары*(ц/цц)*а, цяжэй паміры*(ц/цц)*а.

Назавіце ў прыказках супрацьлеглыя па значэнні дзеясловы. У якой форме яны ўжыты?

Якія літары трэба ўставіць у словы?

Запішыце па памяці адну прыказку на выбар.

**126.** Прачытайце і адгадайце загадку.



У бабулін агарод
апусціўся верталёт.
Па лістах зашорхаў страх
ды памчаўся праз чарот.
Вінт адзін, а колькі ж крылцаў —
як злічыць, не памыліцца?

*Д. Бічэль.*



***зашóрхаў страх*** — тут: *моцна зашумеў*

Выпішыце з загадкі дзеясловы, ужытыя ў неазначальнай форме. Пастаўце ў іх націск. Змяніце гэтыя дзеясловы так, каб яны адказвалі на пытанне ш т о з р о б і ц ь?

Вызначце час, лік і род астатніх дзеясловаў.



Правообладатель Национальный институт образования

**127.** Дапоўніце сказы дзеясловамі, якія падыходзяць па сэнсе.

1. *(вучыцца, вучыць)* Таццянка любіць ... вершы на памяць. Паўлік стараецца добра ... у школе. 2. *(падзяліць, падзяліцца)* Сын захацеў ... радасцю з бацькамі. Дзеці вырашылі ... цукеркі пароўну. 3. *(пракаціць, пракаціцца)* Сяргейка хоча ... на веласіпедзе. Тата паабяцаў ... дачушку на машыне.

## Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне)

**128.** Прачытайце сказы.

Я малюю кветкі.
Ты малюеш рэчку.
Ён малюе луг.
Мы малюем нашу краіну.
Вы малюеце разам з намі.
Яны прыгожа малююць.



Выпішыце са сказаў дзейнік і выказнік. Якой часцінай мовы з'яўляецца выказнік у сказах? Абазначце канчаткі дзеяслова.

**Завяжы вузялок!**

Дзеясловы цяперашняга і будучага часу змяняюцца па асобах і ліках (спрагаюцца). Асобу і лік дзеяслова можна вызначыць па канчатку і па займенніку, з якім спалучаецца дзеяслоў: ***я** ліч[у]*, ***ты** ліч[ыш]*, ***ён** ліч[ыць]*, ***вы** ліч[ыце]*, ***яны** ліч[аць]*.



Правообладатель Национальный институт образования

**129.** Разгледзьце табліцы спражэння дзеясловаў.

## Цяперашні час

| Асоба | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| 1-я | ***я*** (ш т о  р а б л ю?)<br>*чыта*[*ю*], *бач*[*у*] | ***мы*** (ш т о  р о б і м?)<br>*чыта*[*ем*], *бач*[*ым*] |
| 2-я | ***ты*** (ш т о  р о б і ш?)<br>*чыта*[*еш*], *бач*[*ыш*] | ***вы*** (ш т о  р о б і ц е?)<br>*чыта*[*еце*], *бач*[*ыце*] |
| 3-я | ***ён*** *(яна, яно)*<br>(ш т о  р о б і ц ь?)<br>*чыта*[*е*], *бач*[*ыць*] | ***яны***<br>(ш т о  р о б я ц ь?)<br>*чыта*[*юць*], *бач*[*аць*] |

## Будучы час

| Асоба | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| 1-я | ***я*** (ш т о  з р а б л ю?)<br>*выйд*[*у*], *замаўч*[*у*] | ***мы*** (ш т о  з р о б і м?)<br>*выйдз*[*ем*], *замаўч*[*ым*] |
| 2-я | ***ты*** (ш т о  з р о б і ш?)<br>*выйдз*[*еш*], *замаўч*[*ыш*] | ***вы*** (ш т о  з р о б і ц е?)<br>*выйдз*[*еце*], *замаўч*[*ыцé*] |
| 3-я | ***ён (яна, яно)***<br>(ш т о  з р о б і ц ь?)<br>*выйдз*[*е*], *замаўч*[*ыць*] | ***яны***<br>(ш т о  з р о б я ц ь?)<br>*выйд*[*уць*], *замаўч*[*аць*] |

На якія пытанні адказваюць дзеясловы 1-й асобы адзіночнага і множнага ліку? 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку? 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку?

**130.** Праспрагайце дзеясловы *спяваць, палячыць*. Карыстайцеся табліцамі з папярэдняга практыкавання.

У з о р: *я* (ш т о  р а б л ю?) *спява*[*ю*], (ш т о  з р а б л ю?) *паляч*[*у*]



Правообладатель Национальный институт образования

ты (ш т о  р о б і ш?) ..., (ш т о  з р о б і ш?) ...
ён (ш т о  р о б і ц ь?) ..., (ш т о  з р о б і ц ь?) ...
мы (ш т о  р о б і м?) ..., (ш т о  з р о б і м?) ...
вы (ш т о  р о б і ц е?) ..., (ш т о  з р о б і ц е?) ...
яны (ш т о  р о б я ц ь?) ..., (ш т о  з р о б я ц ь?) ...

**131.** Знайдзіце ў сказах дзеясловы. З якімі асабовымі займеннікамі яны звязаны? Вызначце час, асобу і лік дзеясловаў.

1. **Я** іду ў пуховых тапках, на каціных мяккіх лапках. *(К. Камейша.)* 2. **Мы** ў двары, пад небам родным, скачам з дожджыкам лагодным. *(Г. Скаржынская.)* 3. Сіні мячык, сіні мячык, **ты** па сцежцы лоўка скачаш. *(В. Коўтун.)* 4. Кветку-сон **яна** не рушыць, для гербарыя не сушыць. *(Т. Мушынская.)* 5. Наш Дзяніска сёння хворы, не ў настроі, не ў гуморы, апетыту **ён** *(не)* мае, *(не)*смяецца, *(не)*спявае. *(П. Сушко.)* 6. **Яны** імкнуць да рэчкі за клейкаю гразёй, трывалае гняздзечка будуюць пад страхой. *(М. Хведаровіч.)* 7. **Вы** будзеце з намі вадзіць карагод. *(Н. Галіноўская.)*

Спішыце сказы, у якіх сустрэліся слоўнікавыя словы.

***апеты́т***



**132.** Спішыце загадкі, раскрываючы дужкі. Запішыце словы-адгадкі.



1. Хочаш ты альбо *(не)*хочаш,
*(да)*цябе ён прыйдзе ноччу.
Расхіне́ свой парасон
і спаўе *(у)*пяшчоту ... .

*Л. Багдановіч.*



Правообладатель Национальный институт образования

2. Я хаджу, нібыта *(у)*тапках,
кіпцюркі *(у)*мяне *(на)*лапках.
Я *(без)*мыла, *(без)*вады
мыю сам сябе заўжды.
*Н. Галіноўская.*





***спаўе́ ў пяшчоту*** — тут: *аху́тае пяшчотай*; рус. *окутает нежностью*

Знайдзіце ў загадках дзеясловы. Вызначце іх час, асобу і лік.

**133.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

1. Усякая птушка сваё гняздо бароніць. 2. Дзе сасна ні стаіць, а ўсё свайму бору шуміць. 3. Кожная птушка гняздо сваё ведае. 4. Пераначуем — болей пачуем. 5. На дзень станеш — на два адстанеш. 6. Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца.

Вызначце час, асобу і лік дзеясловаў. Карыстайцеся падказкай.

Падказка: *птушка (яна)* ***бароніць*** — цяп. ч., 3-я ас., адз. л.; ***пераначуем*** *(мы)* — буд. ч., 1-я ас., мн. л.

У якой прыказцы нельга вызначыць час і лік дзеясловаў? Чаму?

?! Ці можна вызначыць асобу дзеясловаў у неазначальнай форме?

### Завяжы вузялок!

**У дзеясловаў у неазначальнай форме нельга вызначыць асобу.**



Правообладатель Национальный институт образования

**134.** Прачытайце верш. Чым усхваляваны хлопчык? Калі вучні стаяць на ганаровай варце каля Вечнага агню?



## На варце ганаровай

Васілёк, на дзіва, ціхі, строгі,
на пачэснай варце ўпершыню.
На прасторнай плошчы Перамогі
ён стаіць ля Вечнага агню.

Плешча мора флагаў пурпуровых,
ландышаў лясных звініць паток,
і стаіць на варце ганаровай
сын салдата — хлопчык Васілёк.

*Э. Агняцвет.*

Выпішыце з верша дзеясловы. Вызначце іх час, асобу і лік.



Раскажыце, хто з вучняў стаіць на ганаровай варце на плошчы Перамогі. Калі з'явіўся Пост № 1? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў старэйшых.

Якія вядомыя помнікі салдатам і ахвярам Вялікай Айчыннай вайны ёсць у Беларусі? Якія з іх знаходзяцца ў вашай мясцовасці?









Правообладатель Национальный институт образования

**135.** Прачытайце тэкст. Куды прыйшлі мама з Верачкай? Пра што даведалася дачушка ад мамы на плошчы Перамогі?

## Вечны агонь

Пасярод плошчы стаіць высокі помнік. Перад ім гарыць Вечны агонь. Да помніка падыходзяць дарослыя і дзеці. Яны стаяць, маўчаць. Многія сюды прыносяць кветкі.

Верачка прыйшла да помніка разам з мамай. Дзяўчынка была ў святочнай сукенцы. У руках яна трымала ружу.

Маці сказала дачушцы, што Вечны агонь ніколі не згасне. Ён напамінае пра тых, хто загінуў за мір на зямлі. Вечны агонь гарыць не толькі ля помніка, але і ў людскіх сэрцах.

Маці стаяла моўчкі. Маўчала і Верачка. Потым яна нахілілася і паклала каля помніка кветку. *(Паводле Е. Пяршай.)*

Знайдзіце ў тэксце дзеясловы цяперашняга і будучага часу, вызначце іх асобу і лік. У дзеясловах прошлага часу назавіце суфіксы.

Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

Рм Вызначце тып тэксту. Падзяліце яго на часткі і складзіце план. Пісьмова перакажыце тэкст па плане.

**136.** Спішыце. Устаўце ў словы патрэбныя літары.

Сё*(н/нн)*я я пакажу ўнуку Арцёмку сузор'е Лебедзя. Яно спрыяе а*(д/т)*лётным птушкам у іх нялёгкай дарозе на поўдзень.



Правообладатель Национальный институт образования



Мы стаім на ўзгорку. Над намі рассцілае*(ц/цц)*а зорны ручнік Млечнага шляху. Уздоўж яго цягне*(ц/цц)*а сузор*(ь/’)*е Лебедзя. Яно нагадвае сілуэт птушкі. *(Паводле М. Бусько.)*



***спрыя́е*** — *дапамагае*
***Млечны шлях*** — *мноства зорак, падобнае на светлую паласу, расцягнутую па небе*
***сілуэ́т*** — *абрыс, контур*

Падкрэсліце ў тэксце дзеясловы. Вызначце іх час, лік і асобу.

## Першае і другое спражэнне дзеясловаў. Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы адзіночнага ліку

**137.** Праспрагайце дзеясловы *танцаваць, зляпіць.* Запішыце, выдзеліце канчаткі дзеясловаў.

я (што раблю?) ..., (што зраблю?) ...
ты (што робіш?) ..., (што зробіш?) ...
ён (што робіць?) ..., (што зробіць?) ...

мы (што робім?) ..., (што зробім?) ...
вы (што робіце?) ..., (што зробіце?) ...
яны (што робяць?) ..., (што зробяць?) ...

У форме якой асобы і ліку дзеясловы маюць аднолькавыя канчаткі? У якіх формах яны маюць розныя канчаткі?


Правообладатель Национальный институт образования

## Завяжы вузялок!

Дзеясловы цяперашняга і будучага часу ў залежнасці ад канчаткаў падзяляюцца на два спражэнні: першае і другое.

**138.** Разгледзьце табліцы спражэння. Прачытайце дзеясловы ў табліцах.

### I спражэнне дзеясловаў

| Асоба | | Адзіночны лік | | Множны лік |
|---|---|---|---|---|
| 1-я: | *я* | *малю*[ю], *збяр*[у] | *мы* | *малю́*[ем], *збяр*[о́м] |
| 2-я: | *ты* | *малю*[еш], *збяр*[эш] | *вы* | *малю́*[еце], *збер*[аце́] |
| 3-я: | *ён (яна, яно)* | *малю*[е], *збяр*[э] | *яны* | *малю*[юць], *збяр*[уць] |

### II спражэнне дзеясловаў

| Асоба | | Адзіночны лік | | Множны лік |
|---|---|---|---|---|
| 1-я: | *я* | *маўч*[у], *падзял*[ю] | *мы* | *маўч*[ым], *падзел*[ім] |
| 2-я: | *ты* | *маўч*[ыш], *падзел*[іш] | *вы* | *маўч*[ыце́], *падзе́л*[іце] |
| 3-я: | *ён (яна, яно)* | *маўч*[ыць], *падзел*[іць] | *яны* | *маўч*[аць], *падзел*[яць] |



Правообладатель Национальный институт образования

Параўнайце канчаткі дзеясловаў:
1-й асобы множнага ліку I і II спражэння;
2-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння;
2-й асобы множнага ліку I і II спражэння;
3-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння;
3-й асобы множнага ліку I і II спражэння.

Да якога спражэння адносяцца дзеясловы з практыкавання 137?

**Завяжы вузялок!**

**У 1-й асобе адзіночнага ліку канчаткі дзеясловаў I і II спражэння супадаюць. У астатніх асобах дзеясловы I і II спражэння маюць розныя канчаткі.**

**139.** Прачытайце верш. Як ставіцца брацік да сястрычкі, як клапоціцца пра яе?



**Пацешу Верачку**

Маленькую с..стрычку я люблю,
пацешу сёння Верачку:
ёй сонечнага зайчыка злаўлю
і прын..су ў люстэрачку.

*У. Рунцэвіч.*

Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. Знайдзіце ў вершы дзеясловы. Выдзеліце ў іх канчаткі, вызначце асобу і лік.

У асабовых займенніках вызначце асобу, лік і склон.

**Рм** Ці ёсць у вас брат, сястра? Як вы клапоціцеся пра іх?


Правообладатель Национальный институт образования

## Гаварыце правільна!

**[дз’]** **[дж]**

*ву́дзіць — ву́джу*
*садзі́ць — саджу́*
*будзі́ць — буджу́*
*вадзі́ць — ваджу́*

**140.** Дапоўніце сказы дзеясловамі цяперашняга часу 1-й асобы адзіночнага ліку. Выкарыстайце словы для даведкі.

1. Я ... па лесе. 2. Я ... на кветкі. 3. Я ... на пяньку і ... спевы птушак.

С л о в ы д л я д а в е д к і: *глядзець, хадзіць, слухаць, сядзець.*

**141.** Прачытайце. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму будучага часу 1-й асобы адзіночнага ліку. Адгадайце акразагадку.

Многа нас, сясцёр, расце —
аж чырвона на кусце.
Лекі я. Ласунак я.
І ў варэнні смачная.
На агні (паклекатаць) —
ад прастуды (палячыць).

*У. Мацвеенка.*

***паклеката́ць*** *— шумна пакіпець, пабурліць*

Спішыце апошні сказ, раскрываючы дужкі. Выдзеліце канчаткі ў дзеясловах.



Правообладатель Национальный институт образования

**Рм** Дапоўніце сказы патрэбнымі формамі назоўніка-адгадкі. Растлумачце свой выбар.

1. Кустовая ягадная расліна — гэта … . 2. Пахучыя салодкія ягады гэтай расліны — … . 3. Адна ягада малін — гэта … .

**142.** Прачытайце. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў патрэбную форму.

Я вельмі *(любіць)* пакаёвыя р..сліны. Раніцай я ўстаю́ і *(размаўляць)* з імі. Адзін раз у два дні я *(палівацъ)* свой са.. на акне. Удзячныя р..сліны заўсёды ўсыпаны пр..гожымі кветкамі. Я з радасцю *(глядзець)* на іх.

Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Устаўце ў словы патрэбныя літары. Выдзеліце канчаткі ў дзеясловах 1-й асобы адзіночнага ліку.

## Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы множнага ліку I і II спражэння

**143.** Прачытайце верш. Якія пачуцці да роднай зямлі перадае аўтар? Знайдзіце і прачытайце радкі, у якіх выражаецца асноўная думка верша.

### Зямля мая

Зямля мая азёрная —
рабіна за акном,
крынічка ціхамоўная,
гасцінны ветлы дом.



Правообладатель Национальный институт образования

Іду жытнёвай сцежкаю —
мне звоняць жаўрукі,
блакітнаю ўсмешкаю
вітаюць васількі.
Ты працаю славутая,
карміцелька зямля.
Цярплівая, пакутная,
ты назаўжды мая.

*Н. Галіноўская.*



***ве́тлы — ве́тлівы***

Выпішыце з верша дзеясловы. Выдзеліце ў іх канчаткі, вызначце асобу і лік.

Карыстаючыся табліцамі з практыкавання 138, вызначце спражэнне дзеясловаў. У якім выпадку ўзніклі цяжкасці з вызначэннем спражэння?

?! Як вызначыць спражэнне дзеяслова *іду*?

**144.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.

**3-я асоба мн. л.**

**І спр. (-□, -□)** ← → **ІІ спр. (-□, -□)**

**Завяжы вузялок!**

Каб вызначыць, да якога спражэння адносіцца дзеяслоў, трэба паставіць яго ў форму 3-й асобы множнага ліку.

Дзеяслоў І спражэння мае канчатак -***уць*** або -***юць***.

Дзеяслоў ІІ спражэння мае канчатак -***аць*** або -***яць***.



Правообладатель Национальный институт образования

**145.** Прачытайце тэкст. Ці даводзілася вам лавіць рыбу? Раскажыце пра сваю рыбалку.

## Рыбалка

Сонца садзіцца павольна. На траву **падае** раса. Паступова **халаднее** трава. Потым сонца зусім **заплывае** за небасхіл.



Вось у гэты час шчупак **выходзіць** на паляванне. Пільнае вока рыбака нястомна **сочыць** за паплаўком. А ён гайдаецца, варушыцца на вадзе. Туман **гусцее**, становіцца белым. **Сядзіш** на беразе і **не змаргнеш** вокам. Камары **звіняць** каля вуха, але паварушыцца нельга.

Ра́птам паплавок **затрымціць** і **заскача** на вадзе. Гэта трапіў на кручок шчупак. *(Паводле В. Дайліды.)*

Вызначце час, асобу, лік выдзеленых дзеясловаў. Пастаўце іх у форму 3-й асобы множнага ліку. Абазначце канчаткі, вызначце спражэнне.

У з о р: *Падае* (цяп. ч., 3-я ас., адз. л.) — *пада*|*юць*| — *І спр.*, ...

*уні́зе*

**146.** Прачытайце і запомніце прыказку. Чаму так гавораць?

Увосень на дварэ пагод сем: сее, вее, круціць, муціць і рве, і лье, і знізу мяце.

Пастаўце дзеясловы ў форму 3-й асобы множнага ліку. Запішыце. У дзеясловах абазначце канчаткі, вызначце спражэнне.



Правообладатель Национальный институт образования

Запішыце слоўнікавае слова. Выпішыце з прыказкі словы, аднакаранёвае да слоўнікавага. Абазначце корань у гэтых словах.

**147.** Прачытайце верш. Што абазначае выдзелены выраз? Што прадказваюць камары?



### Камары

Ад зары
і да зары
над ракою
камары
ў дуду сваю
гудуць
ды ў ступе
**мак таўкуць.**

Заўтра будзе
добры дзень —
ані хмарачкі
нідзе!
Нездарма ж яны
гудуць
ды ў ступе
**мак таўкуць.**

*С. Новік-Пяюн.*

Запішыце па памяці першы сказ. Знайдзіце ў ім дзеясловы, выдзеліце ў іх канчаткі. Вызначце час, асобу, лік, спражэнне дзеясловаў.

Знайдзіце дзеяслоў у другім сказе. Вусна вызначце яго спражэнне.



Пра якія яшчэ прыметы добрага надвор'я вы можаце расказаць? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў старэйшых.



**148.** Спішыце сказы. Знайдзіце ў іх дзеясловы, абазначце канчаткі.

1. На ліпах шпакоўні радуюць вока. *(Ю. Свірка.)* 2. Усе глядзяць на мой сцяжок: ён — праўнук Сцяга



Правообладатель Национальный институт образования

Перамогі. *(І. Муравейка.)* 3. Ігар і Паўлік ведаюць: дзеду шмат гадоў. *(М. Даніленка.)* 4. Слава мамiным рукам, што работу любяць і прыносяць сонца нам, ласкаю галубяць. *(М. Пазнякоў.)* 5. Зябнуць раннем коцікі, аж дрыжацьваркоцікі. *(А. Дзеружынскі.)*

Вызначце час, асобу, лік, спражэнне дзеясловаў.

## Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку I і II спражэння

**149.** Пастаўце дзеясловы ў форму 3-й асобы множнага ліку і вызначце іх спражэнне.

Ісці, рабіць, браць, сказаць, бачыць, чытаць.

Разгледзьце схему.

**1-я асоба мн. л.**

**I спр.**
**(мы)** *ідзём, чытаем, бяром, скажам*

**II спр.**
*робім, бачым*

Назавіце канчаткі дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку I спражэння; II спражэння.

**150.** Дзеясловы ў неазначальнай форме пастаўце ў форму 1-й асобы множнага ліку па ўзоры.

*Ісці — ідзём*, ве́сці — вя.., не́сці — ня.., трэ́сці — тра.., жыць — … .

*Чытаць — чытаем*, высахнуць — высахн.., пераехаць — …, выбіраць — выбі.., загадаць — … .


Правообладатель Национальный институт образования

*Браць* — *бяр*[*ом*], секчы — сяч.., набраць — набя.., запрэ́гчы — ..., таўчы́ — ... .

*Сказаць* — *скаж*[*ам*], захацець — ..., зрэзаць — ..., змазаць — ..., змагчы́ — ... .

**151.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.

**І спр. (1-я асоба мн. л.)**

**пад націскам** -□, -□

**не пад націскам** -□, -□

**152.** Прачытайце скорагаворку. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму 1-й асобы множнага ліку.

Сёння мы гасцей *(чакаць)*.
Варым, смажым, *(выпякаць)*.
Атрымаўся стол багаты.
Просім, госцейкі, на свята.

*Н. Галіноўская.*

Спішыце. Выдзеліце канчаткі ў дзеясловах 1-й асобы множнага ліку. Вызначце іх спражэнне.

**Рм** Раскажыце, як вы сустракаеце гасцей. З якімі словамі звяртаецеся да іх, калі развітваецеся?

***да пабачэ́ння***

**153.** Дзеясловы ў неазначальнай форме пастаўце ў форму 1-й асобы множнага ліку па ўзоры.

*Рабіць* — *роб*[*ім*], сядзець — ..., карміць — ..., хадзіць — ... .

*Бачыць* — *бач*[*ым*], гаварыць — ..., крычаць — ..., замаўчаць — ... .



Правообладатель Национальный институт образования

**154.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.

**II спр. (1-я асоба мн. л.)**

| **пасля мяккіх зычных** | **пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных** |
| --- | --- |
| -□ | -□ |

**155.** Прачытайце. Дзеяслоў у дужках пастаўце ў форму 1-й асобы множнага ліку. Запішыце прыказку па памяці.

Увосень за стол *(прасіць)*.

**156.** Прачытайце верш. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму 1-й асобы множнага ліку.

**Асі́лкамі расцём**



На спартыўную пляцоўку
мы *(спяшаць)* з братам зноўку.
*(Скакаць)*, *(бегаць)* на волі,
*(не)*стамляемся ніколі.
Спорт *(не)*любіць леных, кволых.
Захапляемся футболам,
захапляемся хакеем —
і ніколі не *(хварэць)*.
Кажа дома брат Арцём:
«Мы асілкамі *(расці)*!»

*В. Кудлачоў.*

***кволы*** — *фізічна не разві́ты, хвараві́ты*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Выдзеліце канчаткі ў дзеясловах, форму якіх змянілі. Вызначце іх спражэнне.



Правообладатель Национальный институт образования

**157.** Прачытайце верш. Які ён: жартоўны ці сур'ёзны? Чаму?

### Улоў

**Хваліўся** ўловам:
— **Засолім** палову,
з другой палавіны
**засушым** васьміну.
Васьміну **засмажым** —
з гасцямі з'ядзім,
а чвэртку **адважым** —
пасля **прададзім**.

Усім бы хапіла,
ды кошка **схапіла**.

*В. Зуёнак.*



Вызначце час выдзеленых дзеясловаў. Выпішыце ў адзін слупок дзеясловы прошлага часу, у другі — будучага. Вызначце асобу і спражэнне дзеясловаў будучага часу.

**158.** Да прапанаваных дзеясловаў падбярыце сінонімы, выкарыстоўваючы словы для даведкі. Пастаўце іх у форму 1-й асобы множнага ліку. Запішыце па ўзоры.

*Акруж*[*ым*] (II спр.) — *абступ*[*ім*] (II спр.), паправім — ..., аддыхнём — ..., гутарым — ..., даганяем — ..., запрашаем — ..., паведамім — ... .

С л о в ы д л я д а в е д к і: *адпачыць, абступі́ць, зазываць, гаварыць, наганяць, аб'яві́ць, выправіць.*



Правообладатель Национальный институт образования

**159.** Вусна складзіце па падказках алгарытм выбару напісання канчаткаў дзеясловаў.

**1. Знаходзім у сказе або падбіраем асабовы ..., з якім спалучаюцца дзеясловы.**

*У школе* ***мы*** *чыта*[?], *піш*[?], *пя*[?], *леп*[?], *ліч*[?].

**2. Па займенніку вызначаем ... і ... дзеясловаў.**

***Мы*** → *чыта*[?], *піш*[?], *пя*[?], *леп*[?], *ліч*[?] (1 ас., мн. л.)

**3. Утвараем форму ... асобы ... ліку дзеясловаў.**

***Яны*** *чытаюць, пішуць, пяюць, лепяць, лічаць.*

**4. Па** ☐ **3-й асобы множнага ліку вызначаем ... дзеяслова.**

*чыта*[*юць*], *піш*[*уць*], *пя*[*юць*] — I спр.
*леп*[*яць*], *ліч*[*аць*] — II спр.

**5. Выбіраем і дапісваем канчатак дзеяслова 1-й асобы ... ліку.**

**I спр.**
- → **не пад націскам ...** *чыта*[***ем***], *піш*[***ам***]
- → **пад націскам ...** *пя*[***ём***]

**II спр.**
- → **пасля мяккага зычнага ...** *леп*[***ім***]
- → **пасля цвёрдага і зацвярдзелага зычнага ...** *ліч*[***ым***]



Правообладатель Национальный институт образования

**160.** Прачытайце. Вызначце тып тэксту, падбярыце да яго загаловак.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Я выходжу ў сад і каля яблыні заўважаю вожыка. Вырашаю пачаставаць яго чым-небудзь. Іду ў хату, наліваю ў кубачак малака, бяру сподачак і падыходжу да яблыні. Стаўлю сподачак перад вожыкам на траву і наліваю малака.

Вожык фыркае ад задавальнення і пачынае піць малако.

Знайдзіце ў тэксце дзеясловы, вызначце іх час, асобу і лік. Назавіце дзеясловы ў неазначальнай форме.

Замяніце займеннік ***я*** на ***мы*** і прачытайце зме́нены тэкст.

Запішыце першы абзац зме́ненага тэксту. У дзеясловах выдзеліце канчаткі, вызначце спражэнне.



**161.** Прачытайце тэкст. Якія канчаткі дзеясловаў трэба дапісаць на месцы пропускаў?

Мы з бацькамі не сядз.. дома ў выхадныя дні. Летам мы адпачыва.. на возеры падарожніча.. . Зімой я і тата гуля.. у хакей. Мама катае на санках сястрычку. Вясной і восенню мы ходз.. у парк наведва.. музеі выставы.

Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі.



Раскажыце, як вы праводзіце выхадныя дні.



Правообладатель Национальный институт образования

## Канчаткі дзеясловаў 2-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння

**162.** Пастаўце дзеясловы ў форму 3-й асобы множнага ліку і вызначце іх спражэнне.

Браць, крочыць, карміць, спяваць, захацець.

Разгледзьце схему.

**2-я асоба адз. л.**

| **I спр.** | **II спр.** |
|---|---|
| **(ты)** *бяр[эш]*, *спява[еш]*, *захоч[аш]* | *корм[іш]*, *кроч[ыш]* |

Назавіце канчаткі дзеясловаў 2-й асобы адзіночнага ліку I спражэння; II спражэння.

**163.** Дзеясловы ў неазначальнай форме пастаўце ў форму 2-й асобы адзіночнага ліку па ўзоры.

*Спяваць* — *спява[еш]*, ве́сці — …, везці — …, не́сці — …, ісці — … .

*Браць* — *бяр[эш]*, набраць — …, араць — …, се́кчы — …, таўчы́ — … .

*Захацець* — *захоч[аш]*, сказаць — …, змазаць — …, змагчы́ — … .

***ара́ць*** — *апрацоўваць зямлю плугам*; рус. — *пахать*

Знайдзіце ў першым радку дзеясловы, якія вымаўляюцца аднолькава, а пішуцца па-рознаму.



Правообладатель Национальный институт образования

**164.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.

**І спр. (2-я асоба адз. л.)**

**пасля галосных і мяккіх зычных** -□

**пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных** -□, -□

**165.** Дапоўніце сказы дзеясловамі з правага слупка ў форме цяперашняга часу.

| | |
|---|---|
| Тата, ты … нас сёння ў школу на машыне? | *весці* |
| Сынок, ты … вечарам сабаку ў парк. | *везці* |

Спішыце сказы. Вызначце асобу і лік дзеясловаў.

**166.** Прачытайце жарт. Што выклікала ў вас усмешку? Якую параду вы далí б Дзіму, які хоча стаць дырэктарам?

**«Дырэктар»**

— Кім ты, Дзіма, хочаш быць, як вырасцеш?
— Дырэктарам.
— І што ты будзеш рабіць?
— Падпісваць кантракты.

*М. Сліва.*

***пóдпіс***

Назавіце ў тэксце дзеясловы ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку. Растлумачце правапіс іх канчаткаў. Якую форму мае дзеяслоў *рабіць* у 2-й асобе адзіночнага ліку?

Выпішыце з тэксту дзеяслоў, аднакаранёвы да слоўнікавага слова. Выдзеліце ў ім корань.


Правообладатель Национальный институт образования

**167.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму 2-й асобы адзіночнага ліку. Вызначце іх спражэнне.

1. Нітак многа,
   а ў клубок не *(зматаць)*.





2. Кругленькі, маленькі,
   а за хвост не *(падняць)*.

Спішыце адну загадку на выбар. Запішыце слова-адгадку. Абазначце канчатак у дзеяслове.

**Гаварыце правільна!**

**паднíмеш і пады́меш**

**168.** Дзеясловы ў неазначальнай форме пастаўце ў форму 2-й асобы адзіночнага ліку па ўзоры.

*Карміць* — *корм*[*іш*], хадзіць — ..., зачыніць — ..., рабіць — ..., сядзець — ... .

*Крочыць* — *кроч*[*ыш*], крычаць — ..., замаўчаць — ..., належаць — ..., бачыць — ... .

**169.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.

**II спр. (2-я асоба адз. л.)**

| пасля мяккіх зычных | пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных |
|---|---|
| -□ | -□ |



Правообладатель Национальный институт образования

**170.** Спішыце прыказкі. Дзеяслоў у дужках пастаўце ў форму 2-й асобы адзіночнага ліку. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі.

1. Аднымі рукамі нямнога *(зрабіць)*. 2. Згодаю двор *(збудаваць)*, а нязгодаю — гатовае *(разгубіць)*.

**Рм** У якіх сітуацыях можна выкарыстаць гэтыя прыказкі?

**Гаварыце правільна!**

| | |
|---|---|
| апранаць — апрана́еш | абуваць — абува́еш |
| апрануць — апране́ш | абуць — абу́еш |
| выйсці — вы́йдзеш | трапіць — тра́піш |
| выходзіць — выходзіш | трапляць — трапля́еш |

**171.** Прачытайце тэкст. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму 2-й асобы адзіночнага ліку.

Невядома, якая сіла ўзнімае ранкам грыбніка з ложка.

Хуценька *(апранаць)* куртку, *(браць)* кош, *(абуваць)* боты, *(выходзіць)* на двор. У вёсцы цішыня і спакой.

*(Выходзіць)* за браму і *(крочыць)* у лес. Нейкі час *(ісці)* уздоўж спелага жыта. Таропка *(праскочыць)* малады ельнічак і *(трапіць)* у стары бор.

Гэта ўжо баравіковыя месцы. *(Паводле Р. Ігнаценкі.)*

***таропка*** *— хутка, скора*

Запішыце сказы, у якіх змянілі форму дзеясловаў. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі.



Правообладатель Национальный институт образования

**172.** Дапоўніце прыказкі патрэбнымі дзеясловамі ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку. Выкарыстайце словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| Не шукаючы, … | *(не)прыставіць* |
| Агню агнём … | *(не)павярнуць* |
| Кіем рэчкі … | *(не)патушыць* |
| За грошы ўсяго … | *(не)знайсці* |
| Адсячэш — … | *(не)купіць* |

Узор: *Не шукаючы, не знойдз*[*еш*] (І спр.).

Запішыце прыказкі, раскрываючы дужкі. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліцеканчаткі. Растлумачце правапіс ***не*** з дзеясловамі.

**173.** Прачытайце верш. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму 2-й асобы адзіночнага ліку.



У тэатры, як у школе:  
не *(пабегаць)* уволю  
і не вельмі *(пакрычаць)*,  
а часцей — зусім *(маўчаць)*.  
Вось і тут звініць званок,  
быццам кліча нас на ўрок.  
Зачыняюцца ўсе дзверы.  
Нашы месцы — у партэры.

*А. Бадак.*

Спішыце першы сказ. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі.

**Рм** Які тэатр наведвалі вы? Якія правілы паводзін у тэатры вам вядомы?



Правообладатель Национальный институт образования

**174.** Замяніце спалучэнні слоў супрацьлеглымі па сэнсе і запішыце. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі.

У з о р: *Адыходз*[*іш*] (II спр.) *ад прыпынку — падыходз*[*іш*] (II спр.) *да прыпынку, ...*

Падлятаеш да аэрадрома — ..., заходзіш у аўтобус — ..., вывозіш з двара — ..., ускочыш на каня — ... .

Выдзеліце ў словах прыстаўкі. Падкрэсліце прыназоўнікі.

**175.** Прачытайце. Дзеяслоў у дужках пастаўце ў форму 2-й асобы адзіночнага ліку. Разгадайце шараду.

Займеннік
плюс
час сутак —
і *(атрымаць)* хутка
замест адказу
адзінку часу.

*У. Мазго.*




Вызначце спражэнне дзеяслова і назавіце яго канчатак у 2-й асобе адзіночнага ліку.

**176.** Прачытайце верш. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму 2-й асобы адзіночнага ліку.

### Божая кароўка

Божая кароўка,
хутка, спрытна, лоўка
зойдзеш *(на)*травінку,
*(сесці)* на былінку,



Правообладатель Национальный институт образования



*(заляцець)* на грушу,
крыльцамі *(варушыць)*.
*(Па)*кветках *(лятаць)*,
шкоднікаў *(знішчаць)*,
нам карысць *(прыносіць)*,
пла́ты *(у)*нас не *(просіць)*.
Божая кароўка —
нашая сяброўка.

*А. Дзержынскі.*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі.

Падкрэсліце сказ, у якім заключаецца асноўная думка тэксту.

## Канчаткі дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку I і II спражэння

**177.** Пастаўце дзеясловы ў форму 3-й асобы множнага ліку і вызначце іх спражэнне.

Пячы, крычаць, карміць, жыць, ведаць.

Разгледзьце схему.

**2-я асоба мн. л.**

**I спр.**
**(вы)** *ве́да|еце|*, *жыв|яце́|*, *печ|аце́|*

**II спр.**
*корм|іце|*, *крыч|ыце́|*

Назавіце канчаткі дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку I спражэння; II спражэння.


Правообладатель Национальный институт образования

**178.** Дзеясловы ў неазначальнай форме пастаўце ў форму 2-й асобы множнага ліку па ўзоры.

*Жыць* — *жывяце́*, несці — …, ве́сці — …, ісці — …, трэ́сці — тра.. .

*Пячы* — *печаце́*, клікаць — клі́ч.., секчы — сеч.., набраць — набе.., таўчы — … .

*Ведаць* — *ве́даеце*, паліваць — …, кусаць — …, снедаць — …, напаўняць — … .

**Гаварыце правільна!**

несяце́, ведзяце́, ідзяце́, везяце́, жывяце́, кладзяце́

**179.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.

**І спр. (2-я асоба мн. л.)**

| пасля галосных і мяккіх зычных | пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных |
| --- | --- |
| -☐, -☐ | -☐ |

**180.** Прачытайце. Дапоўніце дзеясловы 2-й асобы множнага ліку патрэбнымі канчаткамі. Што змяшчае гэты тэкст: параду, рэцэпт?

### Як зварыць курыны булён?

Падрыхтаванае курынае мяса заліва́еце халоднай вадой. Калі яна закіпіць, **зніма́..** пену. **Кладз..** ачышчаную моркву і цыбуліну. Ва́рыце на слабым агні да гатоўнасці мяса. У канцы прыгатавання дадаяце́ соль, лаўровы ліст.



Правообладатель Национальный институт образования

Булён **працэ́джва.. . Разліва́..** яго па талерках і падаяце́ з кавалкамі курынага мяса.

Выпішыце з тэксту выдзеленыя дзеясловы. Вызначце іх спражэнне, дапішыце канчаткі.



Якая любімая страва ёсць у вашай сям'і? Ці ведаеце вы, як яе прыгатаваць? Дайце яе рэцэпт аднакласнікам. Пры неабходнасці запытайцеся пра рэцэпт стравы ў сваякоў.

**181.** Дзеясловы ў неазначальнай форме пастаўце ў форму 2-й асобы адзіночнага ліку па ўзоры.

*Карміць — корм*[*іце*], рабіць — ..., сядзець — седзі..́, хадзіць — ..., зачыні́ць — зачы́н.. .

*Крычаць — крыч*[*ыце́*], замаўчаць — ..., належаць — нале́.., лячыць — ..., лічыць — ... .

Знайдзіце ў апошнім радку словы, якія адрозніваюцца адным гукам.

**182.** Дапоўніце сказы дзеясловамі ў форме цяперашняга часу.

1. Як вы ..., ці правільна пастаўлены знакі прыпынку ў сказе? 2. Чым вы ... ангіну? 3. Дзеці, вы вельмі добра ... да тысячы!

*лячыць*
*лічыць*

Растлумачце значэнне дзеясловаў, ужытых у сказах. Якія з дзеясловаў з'яўляецца мнагазначным словам, а які — адназначным?

Вызначце асобу і лік дзеясловаў.



Правообладатель Национальный институт образования

## Будзьце ўважлівыя!

| Дзеянне | Загад выканаць дзеянне |
|---|---|
| *Вы заўсёды **корм**[**іце**] рыбак.*<br>*Вы **зачы́н**[**іце**] дзверы на замок?*<br>*Вы **ходз**[**іце**] на трэніроўку?* | ***Карм́іце** рыбак кожны дзень.*<br>***Зачыні́це** за сабой дзверы.*<br>*Заўсёды **хадзі́це** на трэніроўку.* |

**183.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.

**II спр. (2-я асоба мн. л.)**

**пасля мяккіх зычных** -☐

**пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных** -☐

**184.** Прачытайце пары сказаў. Выпішыце апавядальныя і пытальныя сказы.

1. Ідзі́це хутчэй у школу. Калі вы ідзяце́ ў тэатр? 2. Зрабіце заданне самастойна. У наступны раз вы зробіце менш памылак. 3. Каго вы запросіце ў госці? Запрасіце на свята сваіх сяброў. 4. Адкажы́це на пытанні да тэксту. Ці адка́жаце вы на маё пытанне? 5. Вы вельмі прыгожа пі́шаце. Пішы́це ў сшытках прыгожа!

Выдзеліце канчаткі ў дзеясловах. Вызначце іх час, асобу, лік і спражэнне.

***ме́нш***

Падкрэсліце словы, аднакаранёвае да слоўнікавага.



Правообладатель Национальный институт образования

**185.** Прачытайце прыказкі. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму будучага часу 2-й асобы множнага ліку.

1. Менш (*пагаварыць*), больш (*зрабіць*). 2. Дзіравай кішэні не (*напоўніць*). 3. Салаўя песнямі не (*накарміць*). 4. Слязамі бядзе не (*памагчы*). 5. Адрэзанай лусты не (*прыляпі́ць*). 6. Згубленай часінкі не (*знайсці*).

***лу́ста** — адрэзаны вялікі плоскі кавалак хлеба, сала*

Спішыце, вызначце спражэнне дзеясловаў, абазначце ў іх канчаткі.

**186.** Прачытайце. Што аб'ядноўвае дзеясловы кожнага рада?

Бачыце, гаворыце, ву́чыце, ..., ... .
Кі́даеце, думаеце, лётаеце, ..., ... .
Прывозіце, корміце, зачы́ніце, ..., ... .
Несяце́, везяце́, льяце́, ..., ... .

Спішыце. Дапоўніце кожны рад слоў. Выкарыстайце словы для даведкі. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі.

Словы для даведкі: *робіце, лечыце, возіце, лезеце, жывяце́, смажыце, ведзяце́, збіраеце.*

**187.** Прачытайце словы. Да дзеясловаў з левага слупка падбярыце блізкія па значэнні дзеясловы з правага слупка. Запішыце дзеясловы парамі.

| | |
|---|---|
| гаварыць | заміна́ць |
| перавязаць | гу́тарыць |
| перашкаджа́ць | забінтаваць |


Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце сказы. Вызначце асобу, лік, спражэнне дзеясловаў. Замяніце дзеясловы на блізкія па значэнні.

1. Пра што вы гаворыце на перапынку? 2. Вы перашкаджа́еце мне прыбіраць у пакоі. 3. Вы перавя́жаце рану на руцэ?

Запішыце сказы, якія ў вас атрымаліся.

**188.** Прачытайце загадку і адгадайце яе.

Мы засынаем да вясны,
мы бачым залатыя сны,
мы ўвесну не мінём калод,
мы вельмі, вельмі любім мёд.

*У. Мацвеенка.*



***не мінём калод*** — тут: *не пройдзем міма вуллёў*

Знайдзіце ў загадцы дзеясловы. Вызначце іх асобу і лік.

Які займеннік сустрэўся ў сказе? Замяніце яго на займеннік ***вы*** і прачытайце загадку. Як змянілася асоба дзеясловаў?

**189.** Прачытайце загадку. Дзеяслоў у дужках пастаўце ў форму 2-й асобы множнага ліку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку. Вызначце спражэнне дзеясловаў.

Белыя бярэцікі,
залатыя тварыкі.
Іх між траў *(прыкмеціць)* —
ззяюць, як ліхтарыкі.

*М. Пазнякоў.*






Правообладатель Национальный институт образования

**190.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

1. *(Па)*бацьку *(па)*зна́еш сыноў. 2. Языком сена *(не)*накосіш. 3. *(Не)*пакладзеш, то і *(не)*возьмеш. 4. Калі рана ўстанеш, дык усё *(па)*спееш. 5. Колькі робіш, столькі *(з/с)*робіш. 6. *(На)*дзень раней пасееш, *(на)*тыдзень раней *(з/с)*бярэш.

Вызначце асобу, лік і спражэнне дзеясловаў. Змяніце адзіночны лік дзеясловаў на множны. Запішыце сказы, якія атрымаліся, раскрываючы дужкі.

## Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння

**191.** Пастаўце дзеясловы ў форму 3-й асобы множнага ліку і вызначце іх спражэнне.

Слухаць, змазаць, карміць, араць, пагаварыць.

Разгледзьце схему.

**3-я асоба адз. л.**

| **I спр.** | **II спр.** |
| --- | --- |
| **(ён)** *слуха*[*е*], *змаж*[*а*], *ар*[*э́*] | *корм*[*іць*], *пагавор*[*ыць*] |

Назавіце канчаткі дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага ліку I спражэння; II спражэння.

**192.** Дзеясловы ў неазначальнай форме пастаўце ў форму 3-й асобы адзіночнага ліку па ўзоры.

*Слухаць — слуха*[*е*], ве́сці — ..., не́сці — ..., аб’язджаць — ... .



Правообладатель Национальный институт образования

*Араць — ар*[э], набраць — …, пячы́ — …, браць — … .
*Змазаць — змаж*[а], зрэзаць — …, сказаць — …, змагчы́ — … .

**аб’язджа́ць**

Дапоўніце сказы слоўнікавым словам у форме цяперашняга часу.

1. **У** час канікул ён … шмат гарадо**ў**. 2. Мар**ы**нка акуратна … луж**ы**ны на веласіпе**дз**е.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.
Запішыце сказы, падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік.

**193.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.

**І спр. (3-я асоба адз. л.)**

| **пасля галосных і мяккіх зычных** | **пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных** |
|---|---|
| -□ | -□́, -□ |

**194.** Прачытайце. Выберыце з дужак патрэбную форму дзеяслова. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць скорагаворку.

*(Ткаць, тку, тчэ, ткуць)* ткач тканіну на хустачку Яніне.

Спішыце, вызначце час, асобу, лік, спражэнне дзеяслова. Выдзеліце ў ім канчатак.
Падкрэсліце ў тэксце аднакаранёвыя словы.


Правообладатель Национальный институт образования

**195.** Дзеясловы ў неазначальнай форме пастаўце ў форму 3-й асобы адзіночнага ліку па ўзоры.

*Карміць* — *ко́рм*[*іць*], зачыні́ць — …, рабіць — …, сядзець — …, хадзіць — … .

*Пагаварыць* — *пагавор*[*ыць*], замаўчаць — …, убачыць — …, крычаць — …, належаць — … .

**196.** Намалюйце ў сшытку схему і дапоўніце яе патрэбнымі канчаткамі.

**II спр. (3-я асоба адз. л.)**

**пасля мяккіх зычных** -□ | **пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных** -□

**197.** Прачытайце. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму цяперашняга часу 3-й асобы адзіночнага ліку. З «рассыпаных» літар складзіце і запішыце слова-адгадку.

Страж гароднага парадку
без абноў не *(тужым)*.
Чым найгоршая апратка,
тым надзейней *(служым)*.

*У. Паўлаў.*

*з і п у д л а*

***тужы́ць* — *сумаваць***
***апра́тка* — *вопратка, адзенне***

Спішыце загадку. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі.

Пастаўце націск у дзеясловах. Чым адрозніваецца вымаўленне дзеясловаў з загадкі ў 3-й асобе адзіночнага ліку і ў неазначальнай форме?


Правообладатель Национальный институт образования

**198.** Прачытайце тэкст. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму 3-й асобы адзіночага ліку.

## Не падпусцілі

Сярэдзіна чэрвеня. Ярка *(свяціць)* сонца. Яно палошча ў вадзе свае промні-пырскі. З пагорка, ад рэчкі, *(дзьмуць)* пругкі ветрык. Ён казытліва *(лашчыць)*, *(астуджаць)* твар.

Раптам з боку лесу *(гучаць)* хрыплае карканне. Над старой бярозай я заўважаю дзвюх варон. Яны адганяюць ад дрэва арла. Арол не *(вытрымліваць)* націску варон і *(адступаць)*.

Я падыходжу да бярозы і заўважаю сярод галінак трох маладзенькіх варонак. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

Спішыце сказы, у якіх змянілі форму дзеясловаў. Вызначце спражэнне дзеясловаў, выдзеліце канчаткі.

***казытлíва*** — рус. *щекотливо*

**199.** Прачытайце дзеясловы. Якія з прапанаваных пытанняў можна да іх паставіць?

| | |
|---|---|
| трапіць | што зрабіць? |
| выручыць | што зробіць? |

?! Ці можна дакладна вызначыць, у якой форме (у 3-й асобе адзіночнага ліку або ў неазначальнай) ужыты гэтыя дзеясловы?

Прачытайце наступную загадку. Вызначце асобу, лік выдзеленых дзеясловаў. ?! Што дапамагло вам зрабіць гэта?



Правообладатель Национальный институт образования



Сапсуецца самалёт —
**трапіць** у бяду пілот.
**Выручыць** пілота ён —
незвычайны парасон.

*У. Мацвеенка.*

Спішыце загадку. Абазначце канчаткі ў выдзеленых дзеясловах.

Дапоўніце сказы дзеясловамі *трапіць, выручыць* і запішыце іх.

1. У нядзелю Алегу трэба ... на футбольны матч. 2. Як ... з бяды сяброўку?

У якой форме ўжыты гэтыя дзеясловы ў сказах?

**Завяжы вузялок!**

У дзеясловах у неазначальнай форме нельга выдзеліць канчаткі: *-ць, -ці, -чы* — гэта суфіксы.

**200.** Спішыце сказы. У дужках запішыце пытанні, на якія адказваюць выдзеленыя дзеясловы.

1. Чалавек (...) **крочыць** па дарозе. Прыемна (...) **крочыць** па дарозе летнім ранкам. 2. Вы ведаеце, як трэба (...) **лушчыць** кедравыя арэхі? Уверсе на дрэве ваверка (...) **лушчыць** арэшкі.

*уве́рсе*

Выдзеліце канчаткі ў дзеясловах 3-й асобы адзіночнага ліку. У дзеясловах у неазначальнай форме абазначце суфікс *-ць*.

У якім сказе сустракаецца слоўнікавае слова? Падбярыце да яго антонім і запішыце гэту пару слоў.


Правообладатель Национальный институт образования

**201.** Прачытайце скорагаворку. Дзеясло́ў у дужках пастаўце ў форму 3-й асобы адзіночнага ліку.

Віктар
*(любі́ць)* віктарыны,
А Марына —
мандарыны.
*У. Мазго.*

Спішыце. Вызначце спражэнне дзеяслова, выдзеліце канчатак.

Чым адрозніваецца вымаўленне гэтага дзеяслова ў 3-й асобе адзіночнага ліку і ў неазначальнай форме?

**202.** Спішыце дзеясловы. Пастаўце націск у іх так, каб утварылася форма 3-й асобы адзіночнага ліку.

Зачыніць, паліць, лічыць, пусціць.

Вусна дапоўніце гэтымі дзеясловамі наступныя сказы.

1. Мама акуратна … за сабой дзверы. 2. Маленькі Сяргейка … ад аднаго да дзесяці. 3. Раніцай бабуля … у печы. 4. Мікітка … караблік на ваду.

**203.** Прачытайце загадку. Дзеясловы ў дужках пастаўце ў форму 3-й асобы адзіночнага ліку. Пра якія боты ідзе размова?

**Боты — два, але не пара**

У іх розны нораў
і розныя сце*(ж/ш)*кі:
адзін *(любіць)* плаваць,
другі *(хадзіць)* пешкі.





Правообладатель Национальный институт образования



Напэўна, вам *(быць)*
н*(е/я)*многа работы
самім здагада*(ц/цц)*а,
што гэта за боты.

*К. Крапіва.*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Выдзеліце канчаткі ў дзеясловах 3-й асобы адзіночнага ліку, вызначце спражэнне.

Падкрэсліце дзеясловы ў неазначальнай форме.

**204.** Прачытайце тэкст. Якая пара года ў ім апісваецца? На што ўказвае яго загаловак: на тэму ці на асноўную думку?

## Званочкі

Цвітуць званочкі. Вялікія прыгожыя галоўкі кветак падобныя на званы.



Стракочуць конікі. Зумкаюць пчолы. Спяваюць птушкі. Булькоча крынічка. Над ёй лётаюць стракозы.

На трухлявым пяньку грэе на сонцы спіну яшчарка. Па лістку трыпутніку паўзе божая кароўка.

Дыхнуў ветрык. З куста ядлоўцу адарваліся сярэбраныя павуцінкі. Яны паплылі да чародкі маладых бярозак. Закалыхалася трава. Загойдаліся кветачкі званочкаў. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

**зу́мкаць** — *звінець*
**трыпу́тнік** — *падарожнік*
**ядловец** — рус. *можжевельник*



Правообладатель Национальный институт образования

Знайдзіце ў тэксце дзеясловы. Выпішыце іх у два слупкі: у першы запішыце дзеясловы цяперашняга часу, а ў другі — прошлага.

У дзеясловах цяперашняга часу выдзеліце канчаткі, вызначце лік, асобу і спражэнне. Вызначце лік і род дзеясловаў прошлага часу.

**205.** Вызначце спражэнне дзеяслова *мець*. Запішыце сказы, дапісваючы патрэбныя канчаткі гэтага дзеяслова.

1. Я ма.. вялікі веласіпед. 2. Мы не ма.. клопатаў з кацянятамі. 3. Хлопчык ма.. цудоўную кнігу. 4. Ты ма.. шмат сяброў? 5. Вы ма.. час праверыць напісанае сачыненне. 6. Усё гэта яны ма.. дзякуючы бацькам.

**206.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце словы-адгадкі. Вусна складзіце з імі сказы.



На дзень нараджэння
і іншыя святы
яго мы прыносім
заўсёды дахаты.
Заменіце літару
ў слове калі —
да месца стаянкі
ідуць караблі.

*У. Мазго.*



Выпішыце з загадкі дзеясловы. Выдзеліце ў іх канчаткі, вызначце лік, асобу і спражэнне.

Знайдзіце ў загадцы асабовыя займеннікі. Вызначце іх асобу, лік, склон.



Правообладатель Национальный институт образования

**207.** Размяркуйце словы на дзве групы.Запішыце іх у два слупкі. Укажыце прымету, па якой былі згрупаваны словы.

**Лечыш, лятаеш, замаўчым, змажам, набераце, загаворыце, нясе, натрасе, ходзяць, сядзяць.**

**208.** Выберыце правільнае выказванне і прадоўжыце яго.

Дзеясловы *ліць* і *насіць* маюць

а) розныя канчаткі ў форме 3-й асобы множнага ліку, таму што ... .

б) аднолькавыя канчаткі ў форме 3-й асобы множнага ліку, таму што ... .

**209.** Якія літары трэба ўставіць замест пытальнікаў, каб атрымаліся слоўнікавыя словы-дзеясловы? У якой форме ўжыты ўсе гэтыя дзеясловы?

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | *з* | ? | ? | |
| | | *г* | ? | ? | ? | ? | *ць* |
| *а* | ? | ? | ? | ? | ? | ? | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *ц* | ? | ? | ? | *ці* |
| *в* | ? | ? | ? | |

З двума дзеясловамі на выбар складзіце і запішыце сказы. У сказах выкарыстайце дзеясловы ў форме 3-й асобы адзіночнага ліку.

**210.** Выберыце правільнае выказванне і прадоўжыце яго.

У дзеяслове *блішчаў*

а) можна вызначыць асобу, таму што ... .

б) нельга вызначыць асобу, таму што ... .



Правообладатель Национальный институт образования

**211.** Прачытайце. Да якой працы рыхтуецца дзед Антось? Што абазначае выдзелены выраз у вершы? Ці ведаў унук пра гэта значэнне выразу?

## Што на носе

Мой дзед Антось
кляпае косы
і кажа мне:
— Касьба **на носе.**

А я гляджу
на дзедаў нос —
жартуе, мабыць,
дзед Антось.

*М. Пазнякоў.*

***ма́быць*** *— напэўна*

Выпішыце з верша дзеясловы. Вызначце іх час, лік, асобу, спражэнне.

**212.** Спішыце тэкст. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі.

Дождж шапаціць недзе ўверсе. Я сяджу пад елкамі чакаю яго заканчэння.

Раптам збоку нехта ша́снуў. Гляджу — вожык. Звярок падкаціўся пад елкі спыніўся узняў угору носік. Ён павадзіў пыскай затупаў да мяне.

— Здароў, дружа! — павітаў я вожыка. *(Паводле Р. Ігнаценкі.)*

***ша́снуў*** *— глуха зашумеў*

Знайдзіце ў тэксце дзеясловы цяперашняга часу. Вызначце іх лік, асобу і спражэнне.



Правообладатель Национальный институт образования

## Адкажыце на пытанні

1. На якія пытанні адказваюць дзеясловы ў неазначальнай форме?
2. На што заканчваюцца дзеясловы ў неазначальнай форме?
3. Што нельга вызначыць у дзеясловаў у неазначальнай форме?
4. Як змяняюцца дзеясловы прошлага часу? Якія суфіксы яны маюць?
5. Як змяняюцца дзеясловы цяперашняга і будучага часу?
6. Як можна вызначыць асобу і лік дзеяслова?
7. Чым адрозніваюцца дзеясловы I і II спражэння?
8. У якой форме дзеясловы I і II спражэння маюць аднолькавыя канчаткі?
9. Як вызначыць спражэнне дзеяслова?

*Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? Да якіх тэм трэба звярнуцца яшчэ раз, каб правільна адказаць на гэтыя пытанні?*



Уявіце, што ў класе праводзіцца канферэнцыя на тэму «Дзеяслоў у беларускай мове». Вам прапанавалі выступіць на гэтай канферэнцыі з дакладам. Падрыхтуйце паведамленне з прыкладамі на адну з наступных тэм: «Неазначальная форма дзеяслова», «Спражэнне дзеясловаў», «Канчаткі дзеясловаў I спражэння», «Канчаткі дзеясловаў II спражэння». Карыстайцеся інфармацыяй, змешчанай на форзацах.


Правообладатель Национальный институт образования

**213.** Прачытайце.

## Брацік

У Сярожы з’явіўся брацік Андрэйка. Ён яшчэ зусім маленькі. Брацік пакуль не хоча пазіраць на Сярожу. Вочкі ў яго амаль увесь час заплюшчаны. Андрэйка любіць паплакаць. У такіх выпадках Сярожу таксама хочацца плакаць.

Аднойчы мама пакінула старэйшага сына за няньку. Андрэйка хуценька наморшчыў тварык расплакаўся на ўсю кватэру. Сярожа загаварыў з брацікам даў яму соску. Ад яго слоў малы крыкун супакоіўся. Сярожа быў задаволены. Ён змог суцешыць Андрэйку. *(Паводле У. Паўлава.)*



Колькі частак у тэксце? Якой з іх адпавядае малюнак? У якой частцы тэксту паказаны клопат старэйшага брата пра малодшага?

Назавіце словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце.

Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы і выдзеліце ў іх корань. Вызначце, якімі часцінамі мовы яны з’яўляюцца.

Выпішыце з тэксту сказы з аднароднымі членамі. Правільна афарміце іх на пісьме.



Правообладатель Национальный институт образования

**214.** Прачытайце верш. Як старэйшыя дзеці клапоцяцца пра малодшую сястрычку?



## Юлька і кашулька

Мы з сястрой каля акна
кормім маннай кашай Юльку…
Есці **вучыцца** яна:
у рот — глыток, два — на кашульку.
Бачым, не пад’ела Юлька,
толькі брудная кашулька.
Юльку зноў пачаў карміць,
а сястра — кашульку мыць.

*У. Мацвеенка.*

Выпішыце з верша ўсе формы назоўніка *Юлька*. Выдзеліце ў іх канчатак і аснову, вызначце склон.

Назавіце ў вершы займеннікі. Вызначце іх асобу і лік.

Вызначце час, асобу, лік выдзеленага дзеяслова. Прыдумайце і запішыце сказ з гэтым дзеясловам у неазначальнай форме.

**215.** Дапоўніце сказы аднароднымі членамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

Летам Вера і … паедуць да бабулі і … . Там дзеці … сваіх сяброў адпачнуць на свежым паветры. Яны пагуляюць і з сабачкам і з … . Дзеці пажывуць у вёсцы а потым … у лагер.

Запішыце два сказы на выбар. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік.

Знайдзіце ў запісаных сказах назоўнікі. Вызначце іх род, лік і склон.


Правообладатель Национальный институт образования

**216.** Прачытайце верш. Якая прыемная падзея адбылася ў жыцці хлопчыка? Пра што ён марыць яшчэ?

Бусел брата мне прынё**с**.
Дзе знайшоў? Сяро**д** бяро**з**.
І таму **А**ндрэй бялявы,
сінявокі, кучаравы.
Можа, бусел ра**сш**чадрыцца —
прынясе мне і сястрыцу,
чарнавокую **С**вятланку.
Пазіраю на буслянку.

*Н. Галіноўская.*

Выпішыце з верша прыметнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Вызначце іх род, лік і склон.

Назавіце асабовы займеннік у вершы. Вызначце яго асобу, лік, склон.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

**217.** Спішыце тэкст, дапісваючы канчаткі назоўнікаў. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

## Нашы справы

У нашай вёсц.. я сябраваў з Ганул.. . Улетку яна часта прыходзіла да мяне. У рук.. дзяўчынка трымала вялікі кошык. Мы беглі на агарод нарывалі поўны кошык лебяд.. . Потым я і Ануля не́слі трав.. пражэрлівым парасят.. . *(Паводле М. Янчанкі.)*

Вызначце род, лік, склон назоўнікаў у тэксце. Падкрэсліце асабовыя займеннікі.


Правообладатель Национальный институт образования

**218.** Прачытайце. На каго падобна лета ў вершы? Назавіце словы і выразы, якія падказалі вам гэта.

### Лета



У сукенцы **каляров..**,
у хусцінцы **васільков..**
ходзіць лета па палях,
па расквечаных лугах.
Дбайна **сонечн..** лета
спеліць ягады для дзетак.
Дораць дзеці лету ўсмешкі,
гульні, песні і пацешкі,
радасць працы і паходаў,
радасць **сонечн..** усходаў.
А расчуленае лета
дорыць ім букеты кветак.

*Н. Галіноўская.*

***дба́йна*** *— старанна*
***спе́ліць*** *— даводзіць да спеласці*
***расчу́ленае*** *— прыемна ўсхваляванае*

Выпішыце з верша выдзеленыя прыметнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Дапішыце канчаткі прыметнікаў. Вызначце іх род, лік і склон.

**219.** Прачытайце тэкст. Якой справай заняты барсук?

### Барсук у ягадах

Стаіць гарачыня. У лесе на палянцы пануе цішыня. Нават гарэзлівы ветрык заснуў у кустах арэшніку. Бегаюць у траве яшчаркі.


Правообладатель Национальный институт образования

Палянку ўсыпалі суніцы. Буйныя ягады расквечваюць яркім агнём траву.

Каля куста ядлоўцу мітусіцца барсук. Ён ласуецца суніцамі. *(Паводле Я. Галубовіча.)*

***пану́е*** — *уладарыць*
***гарэ́злівы*** — *вясёлы, жвавы, непаседлівы*
***мітусі́цца*** — *увіхаецца, мітуслівa робіць штосьці*

Колькі частак у тэксце? Складзіце яго план.

Выпішыце з тэксту дзеясловы ў два слупкі. У першы слупок запішыце дзеясловы прошлага часу. Вызначце іх лік, род. У другі слупок запішыце дзеясловы цяперашняга часу. Вызначце іх асобу, лік.

**220.** Прачытайце загадку. Назавіце адным словам прадметы на малюнку і адгадайце загадку.



Як толькі лета настае,
а*(д/т)*крыем тварыкі свае:
я — сунічка, я — чарнічка,
я — марошка, я — бруснічка.
*(З)*нас варэнне, *(з)*нас і квас.
Ведаеш, як клічуць нас?

*У. Мацвеенка.*

Спішыце, раскрываючы дужкі.

Знайдзіце ў загадцы дзеясловы, выдзеліце ў іх канчаткі. Вызначце час, асобу і лік дзеясловаў.

Назавіце ў загадцы асабовыя займеннікі. Вызначце іх асобу, лік, склон.



Правообладатель Национальный институт образования

**221.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна яе вымаўляць.

Сонейка гарачае,
не пячы — **заплачу** я.
Побач арабінка.
Стань у цень, дзяўчынка.
*Н. Галіноўская.*

***арабі́нка*** — *рабінка*

Назавіце ў скорагаворцы пабуджальныя сказы.

Выпішыце выдзелены дзеяслоў. Абазначце ў ім націск. Утварыце форму 3-й асобы множнага ліку гэтага дзеяслова. Вызначце яго спражэнне.

Вымавіце слова *заплачу* з націскам на апошнім складзе. Вызначце спражэнне гэтага дзеяслова.

**222.** Спішыце. Знайдзіце ў вершы дзеясловы, вызначце іх час. Падкрэсліце дзеяслоў у неазначальнай форме.



**Дзякуй, тата**

Сталі дзеці хварэць.
Варыць лекі мядзведзь:
аднаму — чарнічак,
другому — сунічак,
трэцяму — чабарок,
і для кожнага — мядок.
Бегаюць медзведзяняты:
— Ты выдатны доктар, тата!
*Н. Галіноўская.*


Правообладатель Национальный институт образования

У дзеяслова прошлага часу вызначце лік. У дзеясловаў цяперашняга часу — лік, асобу, спражэнне.

Прыдумайце і запішыце сказ з дзеясловам *варыць* у неазначальнай форме.

**223.** Прачытайце. На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку?

## Начныя фіялкі

Пачатак лета. Дні стаяць пагодлівыя, цёплыя. Калі часам і папырскае дожджык, то не прамарудзіць паказаць сваю ласку сонейка. Вось у такую пару на лугавінах, на лясных палянках зацвітаюць начныя фіялкі.



Удзень гэтыя краскі зусім непрыкметныя. Яны нібы губляюцца сярод пышнай зеляніны і стракатага летняга разнатраўя. **Мала хто зверне ўвагу на сціплыя белыя султанчыкі на тонкай сцяблінцы. Удзень кветка не мае асобага водару.**

Затое вячэрнімі прыцемкамі начныя фіялкі нібы ажываюць. **Белыя султанчыкі выпраменьваюць у начную цемру тонкі водар.** Пахі мацнеюць, плывуць, напаўняюць усё наваколле. *(Паводле Р. Ігнаценкі.)*



***вячэрнія пры́цемкі*** *— паўце́мра адразу пасля заходу сонца*

Прачытайце план. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць?



Правообладатель Национальный институт образования

П л а н

1. Белыя султанчыкі сярод летняга разнатраўя.
2. Цуд у вячэрніх прыцемках.
3. Пара́ цвіцення начных фіялак.

Выпішыце з тэксту выдзеленыя сказы. Назавіце прыметнікі і дзеясловы, пры дапамозе якіх апісваюцца кветкі. Вызначце лік, род і склон прыметнікаў. Вызначце час, асобу і лік дзеясловаў.

**224.** Прачытайце загадку. З літар, якія «схаваліся» на малюнку, складзіце слова-адгадку.

сану

**Цёплае, ласкавае,**
**свеціць, ажыўляе,**
на сябе глядзець
нам не **дазваляе.**
*М. Пазнякоў.*

Якімі часцінамі мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы? Растлумачце правапіс іх канчаткаў.

Выпішыце з загадкі асабовы займеннік. Вызначце яго асобу, лік, склон.

**225.** Прачытайце верш. На каго падобна сонца ў вершы? Назавіце словы і выразы, якія падказалі вам гэта.

## Расчашу сонца

Па-над белым звонкім гаем
раніцай празрыстаю
касы-промні ра(*з*/*с*)пускае
сонца залацістае.


Правообладатель Национальный институт образования

Грабянец густы, прыгожы
я ў матулі папрашу
і залезу *(на)*бярозу,
косы сонцу ра*(з/с)*чашу.

*М. Пазнякоў.*



Спішыце, раскрываючы дужкі.

Вызначце род, лік і склон назоўнікаў, якія сустрэліся ў вершы.

Падкрэсліце дзеясловы 1-й асобы адзіночнага ліку. Вызначце іх спражэнне.

**226.** Прачытайце. Замест якога назоўніка ўжыты ў прыказках займеннік? Назавіце прыказкі. Чаму так гавораць?

1. **Яно** збірае, а зіма праядае. 2. **Яно** на зіму сварыцца. 3. **Яно** на зіму, а зіма на **яго** працуе.

Запішыце адну з прыказак на выбар.

**227.** Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся хутка і правільна іх вымаўляць.

1. Лета, ліпень. Лінуў лівень.
   Пахнуць ліпы і маліны.

   *В. Жуковіч.*

2. Чэрвень спеліць
   чорныя чарніцы.

   *М. Пазнякоў.*

Якой часцінай мовы з'яўляецца кожнае слова ў скорагаворках? Вызначце час і лік дзеясловаў. У дзеясловаў цяперашняга часу вызначце асобу і спражэнне.



Правообладатель Национальный институт образования

**228.** Прачытайце верш. Назавіце ў ім дзеясловы, якія дапамагаюць уявіць ліпень дбайным гаспадаром.

### Лета

Ліпень варыць чай духмяны
выбірае агуркі
ра**сс**ыпае па палянах
ба**б**кі і баравікі.
У малі**нн**іку гукае,
су**шы**ць сена на лугах
і з в**я**рбы ў раку нырае,
не паспеў**шы** зведаць стра**х**.

*В. Савасцюк.*

Спішыце першы сказ. Падкрэсліце ў ім галоўныя члены. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку паміж аднароднымі членамі.

Якой часцінай мовы з'яўляецца кожнае слова ў запісаным сказе?

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах.

**229.** Прачытайце скорагаворку Вольгі Літвіновіч, карыстаючыся падказкай.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ц | я | г | н | і | п | а | й | р | у | ь | о | к. |
| я | ц | к- | о | ч | ш | р | о | в | х | і | ч | т |
| г | н | і | ч | о | к, | к | і | т | а | в | а | с |




Правообладатель Национальный институт образования

**230.** Прачытайце слоўнікавыя словы ў крыжаванцы. Якімі часцінамі мовы яны з'яўляюцца? Якія літары пішуцца ў іх на месцы пропускаў?




Правообладатель Национальный институт образования

# Спіс выкарыстаных крыніц

*Агняцвет, Э.* У свеце дабрыні : зб. вершаў / Э. Агняцвет ; уклад. : А. Бычко, С. Богуш. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2013.

Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя : вучэб. дапам. / склад. : М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. Мінск : Вышэйшая школа, 1996.

Беларуская літаратура : пазакласнае чытанне / аўт.-уклад. Л. І. Строк. Мінск : Юнипресс, 2009.

Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. Янкоўскі ; рэд. М. Суднік. Мінск : выд-ва АН БССР, 1962.

*Бічэль-Загнетава, Д. І.* Гараднічанка : вершы / Д. І. Бічэль-Загнетава. Мінск : Юнацтва, 1993.

*Бусько, М.* Бабрыная навука : скорагаворкі, каламбуры, загадкі, акравершы, казкі : для мал. шк. узросту / М. Бусько ; маст. Н. У. Сустава. — Мінск : Юнацтва, 2001.

*Вітка, В.* Урокі роднага слова : вершы, казкі, апавяданні : для мал. шк. узросту / В. Вітка ; уклад. Т. С. Тарасава ; маст. М. Р. Казлоў. Мінск : Юнацтва, 2001.

Вясёлка. 2005. № 9.

Вясёлка. 2007. № 4, 8—11.

Вясёлка. 2008. № 3, 5,7.

Вясёлка. 2009. № 6, 8—11.

Вясёлка. 2010. № 4—8.

Вясёлка. 2011. № 3, 8, 11, 12.

Вясёлка. 2012. № 2.

Вясёлка. 2013. № 3—7, 10.

Вясёлка. 2014. № 8, 12.

Вясёлка. 2015. № 1—10.

Вясёлка. 2016. № 1—12.

Вясёлка. 2017. № 2.

Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі, п'есы, песні / уклад. М. А. Маляўка. Мінск : Мастацкая літаратура, 2012.

Вяснянка : вершы, апавяданні, казкі беларускіх пісьменнікаў. Мінск : Юнацтва, 1983.



Правообладатель Национальный институт образования

*Галіноўская, Н. В.* Калі я шчаслівы : вершы, казкі, жарты, небыліцы : для мал. шк. узросту / Н. В. Галіноўская ; маст. Г. Хінка-Янушкевіч. — Мінск : Звязда, 2013.

*Галіноўская, Н. В.* Камп'ютарныя сакрэты : вершы, казкі, жарты, небыліцы, загадкі, смяшынкі, лічылкі, скорагаворкі, пацешкі : для мал. шк. узросту / Н. В. Галіноўская ; маст. У. Свентахоўскі. Мінск : Мастацкая літаратура, 2002.

*Галіноўская, Н. В.* Клубок і калабок / Н. В. Галіноўская. Мінск : Юнацтва, 1999.

*Галубовіч, І. І.* Вавёрчыны кватаранты : апавяданні і казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / І. І. Галубовіч ; маст. Н. А. Чарапанава. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2015.

*Галубовіч, Я.* Дзівосы роднай прыроды : апавяданні і казкі для дзяцей / Я. Галубовіч ; маст. К. Г. Разанкова. Мінск : Пачатковая школа, 2012.

*Галубовіч, Я.* Хто рукавічку згубіў? : апавяданні, казкі : кн. для дзяцей дашк. і мал. шк. узросту / Я. Галубовіч. Мінск : Народная асвета, 2012.

*Дайліда, В. Б.* Сустрэча з маленствам : аповесці і апавяданні : для дзяцей мал. шк. узросту / В. Б. Дайліда. Мінск : Мастацкая літаратура, 1980.

*Даніленка, М. П.* Як дажджы памірыліся : апавяданні, казкі : кн. для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Даніленка. Мінск : Народная асвета, 2013.

Дзе жыве зубраня : зб. для мал. шк. узросту / уклад. А. С. Масла ; маст. : В. В. Дударанка, Н. В. Барай. Мінск : Мастацкая літаратура, 2007.

*Дзержынскі, А. С.* Вяселікі : выбранае : вершы, паэмы, казкі, смешкі, пацешкі, небыліцы, жарты : для мал. шк. узросту / А. С. Дзержынскі ; маст. А. Лось. Мінск : Мастацкая літаратура, 1979.

*Ігнаценка, Р. К.* На заечых сцежках : апавяданні і замалёўкі / Р. К. Ігнаценка. Мінск : Мастацкая літаратура, 1973.

*Карызна, У. І.* Лепяць ластаўкі гняздзечкі : вершы, загадкі, казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / У. І. Карызна ; маст. : Т. Беразенская, Н. Каламейцава. Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010.



Правообладатель Национальный институт образования

Крынічка : чытанка : для дашк. і мал. шк. узросту / уклад. Р. М. Міронава ; маст. Т. П. Беразенская. Мінск : Мастацкая літаратура, 2009.

*Ліпскі, У.* Каралева белых прынцэс : Выбр. : Аповесці. Казкі. Апавяданні : для мал. шк. узросту / маст. Я. А. Ларчанка. — Мінск : Юнацтва, 2000.

*Мазго, У.* Прыгоды марахода / У. Мазго. Мінск : Юнацтва, 2002.

*Мацвеенка, У. І.* Займальны родны алфавіт : вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту / У. Мацвеенка. Мінск : Мастацкая літаратура, 2013.

*Мацвеенка, У. І.* Сябрынка : вершы, загадкі, казкі : для мал. шк. узросту / У. І. Мацвеенка ; маст. А. І. Гармаза. Мінск : Юнацтва, 1995.

*Муравейка І. А.* Куды ні пойдзеш — цуды знойдзеш : вершы, апавяданні, казкі, загадкі : для мал. шк. узросту / І. А. Муравейка ; маст. А. П. Пратасеня. Мінск : Юнацтва, 2001.

*Муравейка, І. А.* Растуць дзеці : вершы, апавяданні, казкі, загадкі / І. А. Муравейка. Мінск : Мастацкая літаратура, 2011.

*Муравейка, І. А.* Чые рукі прыгажэйшыя? : вершы, казкі, апавяданні : для дзяцей сярэд. шк. узросту / І. А. Муравейка ; маст. М. Лось. Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012.

*Мушынская Т. М.* Вожыкі ў футбол гуляюць : вершы, апавяданні, казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Т. М. Мушынская ; маст. Г. С. Хінка-Янушкевіч. Мінск : Литература и Искусство, 2008.

Падарожжа ў свет дзівосаў : для мал. шк. узросту / уклад. П. П. Саковіч. Мінск : Беларусь, 2013.

*Пазнякоў, М.* Ехаў поўны воз дзівос / М. Пазнякоў. Мінск : Юнацтва, 1994.

*Пазнякоў, М. П.* Сонейка ўсміхаецца : вершы, скорагаворкі, загадкі : для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. Мінск : Народная асвета, 2013.

*Пазнякоў, М. П.* У родным краі : для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Пазнякоў ; маст. С. Волкаў. Мінск : Литература и Искусство, 2009.

*Паўлаў У. А.* Колькі гусей убачыў Яўсей? : вершы, загадкі, казкі / У. А. Паўлаў. Мінск : Юнацтва, 1994.



Правообладатель Национальный институт образования

*Рунец, П.* Алёшка-верхалаз / П. Рунец ; маст. В. Кандара. Мінск : Беларусь, 1963.

*Рунец, П.* Вясёлыя здарэнні / П. Рунец. Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1962.

Русачок і Белячок : казкі / З. Бяспалы. Песня івалгі : апавяданні : для мал. шк. узросту / Р. Ігнаценка ; маст. У. В. Гладкевіч. Мінск : Юнацтва, 1998.

*Солахаў, А. В.* Падарожжа ад А да Я : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. В. Солахаў. Мінск : Зорны Верасок, 2012.

*Хомчанка, В.* Суседзі / В. Хомчанка. Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1962.

*Хомчанка, В.* Чырвоныя ягады : апавяданні : для мал. шк. узросту / В. Хомчанка ; уклад. Н. С. Мінкевіч ; маст. : К. С. Ракіцкі, А. Г. Званароў. Мінск : Юнацтва, 1999.

*Шах, С. М.* Вучым гаварыць і думаць : вучэб.-метад. дапам. для лагапедаў / С. М. Шах. Мінск : Народная асвета, 1998.

*Янчанка, М. І.* Жменька жалудоў / М. І. Янчанка ; маст. В. В. Сакалоў. Мінск : Юнацтва, 1989.

*Янчанка, М. І.* З людзьмі — добра / М. І. Янчанка ; маст. В. Стасевіч. Мінск : Мастацкая літаратура, 1973.

Делаем вместе [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://delaemvmeste.by/wp-content/gallery/stanislav-zhukovskiy/pervyiy-sneg.jpg.

Правообладатель Национальный институт образования

# ЗМЕСТ


ПРЫМЕТНІК .......................................... 3
Змяненне прыметнікаў па родах, ліках і склонах ....... 3
Скланенне прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду 8
Канчаткі прыметнікаў у назоўным і вінавальным склонах ................................................ 8
Канчаткі прыметнікаў у родным склоне ............... 12
Канчаткі прыметнікаў у давальным склоне ............ 14
Канчаткі прыметнікаў у творным і месным склонах 17
Скланенне прыметнікаў жаночага роду ................. 19
Канчаткі прыметнікаў у назоўным склоне ............ 19
Канчаткі прыметнікаў у родным, давальным, творным і месным склонах ........................................ 23
Канчаткі прыметнікаў у вінавальным склоне ......... 27
Скланенне прыметнікаў множнага ліку .................. 30
Канчаткі прыметнікаў у назоўным і вінавальным склонах ................................................ 30
Канчаткі прыметнікаў у родным і месным склонах 33
Канчаткі прыметнікаў у давальным склоне ............ 36
Канчаткі прыметнікаў у творным склоне ............... 38

ЗАЙМЕННІК ........................................ 44
Займеннік як часціна мовы .............................. 44
Займеннікі 1, 2, 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку 48
Скланненне займеннікаў 1-й асобы ....................... 52
Скланненне займеннікаў 2-й асобы ....................... 55
Скланненне займеннікаў 3-й асобы ....................... 58

ДЗЕЯСЛОЎ .......................................... 64
Змяненне дзеясловаў па часах і ліках .................. 64
Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах. Суфіксы дзеясловаў прошлага часу .................................. 67
Неазначальная форма дзеяслова ......................... 70




Правообладатель Национальный институт образования

Правапіс дзеясловаў на *-ся, -цца* .............................. 73
Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне) .............................. 76
Першае і другое спражэнне дзеясловаў. Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы адзіночнага ліку .............................. 82
Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы множнага ліку I і II спражэння .............................. 86
Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку I і II спражэння .............................. 90
Канчаткі дзеясловаў 2-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння .............................. 96
Канчаткі дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку I і II спражэння .............................. 102
Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння .............................. 108

ПАЎТАРЭННЕ .............................. 119

Спіс выкарыстаных крыніц .............................. 130

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва і нумар установы агульнай сярэдняй адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Свірыдзенка** Вольга Іванаўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбны дапаможнік для 4 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках

Частка 2

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *І. М. Лапанец*
Мастакі *Д. М. Матарыкін, У. А. Пратасеня*
Мастацкі рэдактар *А. П. Пратасеня*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Брыкет*
Карэктары *Д. Р. Лосік, С. С. Міхнёнак, К. В. Шобік*

Падпісана ў друк 04.09.2018. Фармат 70×90/16. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 9,95. Ул.-выд. арк. 4,5. Тыраж 136 630 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск


Правообладатель Национальный институт образования

## Асабовыя займеннікі

| Асоба | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| **1-я** | **я** | **мы** |
| **2-я** | **ты** | **вы** |
| **3-я** | **ён, яна, яно** | **яны** |

## Канчаткі дзеясловаў I спражэння

| Асоба | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| **1-я** | ***-у, -ю*** | ***-ём, -ом, -ам, -ем*** |
| **2-я** | ***-еш, -эш, -аш*** | ***-яце, -аце, -еце*** |
| **3-я** | ***-е, -э, -а*** | ***-юць, -уць*** |

## Канчаткі дзеясловаў II спражэння

| Асоба | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| **1-я** | ***-у, -ю*** | ***-ім, -ым*** |
| **2-я** | ***-іш, -ыш*** | ***-іце, -ыце*** |
| **3-я** | ***-іць, -ыць*** | ***-яць, -аць*** |

**Дзеясловы ў форме**

**цяперашняга і будучага часу** → змяняюцца па асобах і ліках (спрагаюцца)

**прошлага часу** → змяняюцца па ліках і родах (у форме адз. л.)

**Дзеясловы ў неазначальнай форме**

ш т о р а б і ц ь? — ш т о з р а б і ц ь?

**Суфіксы дзеясловаў у неазначальнай форме**

***-ць*** — ***-ці*** — ***-чы***

## Звярніце ўвагу!

| Асоба | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| **1-я** | *ем, дам, бягу* | *ядзім, дадзім, бяжым* |
| **2-я** | *ясі́, дасі́, бяжыш* | *ясцé, дасцé, бежыцé* |
| **3-я** | *есць, дасць, бяжыць* | *ядýць, дадýць, бягуць* |